Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№215 (28579)

8 ЛІСТАПАДА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 9–16

## ПАДЗЕЯ, ШТО ПРАДВЫЗНАЧЫЛА ГІСТОРЫЮ

*Віншаванне Прэзідэнта Беларусі са 100-годдзем Кастрычніцкай рэвалюцыі*

**Дарагія суайчыннікі!**

Віншую вас са знамянальнай датай — 100-гадовым юбілеем Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У сусветнай гісторыі ёсць вехі і падзеі, якія ўплываюць на лёсы народаў, прадвызначаючы іх далейшае развіццё.

Кастрычнік 1917 года азнаменаваны з'яўленнем на палітычнай карце краіны з прынцыпова новым укладам і абвяшчэннем права нацый на самавызначэнне.

Сфарміраваныя ў перыяд Савецкага Саюза сацыяльна-эканамічныя прынцыпы пакладзены ў аснову развіцця прамысловага, навуковага, сельскагаспадарчага і сацыяльнага патэнцыялу сучаснай беларускай дзяржавы.

Сёння мы жывём у суверэннай, незалежнай краіне. Сваім розумам, талентам і працавітасцю будуем моцную, стабільную дзяржаву, у якой галоўнай каштоўнасцю з'яўляецца чалавек — сапраўдны патрыёт і гаспадар роднай зямлі.

Жадаю вам моцнага здароўя, міру і поспехаў у працы на карысць нашай Айчыны.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ, намеснік міністра фінансаў:**

*«Механізм уплаты так званага дарожнага збору сапраўды недасканалы. Мы атрымліваем такія пытанні і на прамых лініях, у запытах, і дэпутаты неаднаразова ўздымалі гэтае пытанне. Таму цяпер усе датычныя ведамствы па даручэнні ўрада працуюць над тым, як механізм уплаты дзяржпошліны можна змяніць. Хачу сказаць, што змены будуць прынятыя не раней за 1 студзеня 2019 года. Змены ў дзяржпошліне датычацца двух пунктаў. Па-першае, само паняцце дзяржпошліны прапануюць замяніць падаткам. Па-другое, прапануецца адвязаць дзяржпошліну ад працэдуры праходжання тэхагляду і спаганяць яе за фактычнае карыстанне дарожнай сеткай, а таксама дазволіць аўтамабілістам выплачваць пошліну часткамі, як страхоўку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9855 | ▲ |
| Еўра | 2,3058 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0736 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ГАРБУЗОВЫЯ КАНІКУЛЫ



Ліза СУЛКОЎСКАЯ і Адрыяна СКАРАПАЦКАЯ прыехалі ў вёску Юркевічы Жыткавіцкага раёна да сваіх бабуль: Ліза — з далёкага абласнога Гомеля, Адрыяна — з райцэнтра. Восеньскія канікулы дзяўчынкам запомняцца гарбузамі з бабуліных агародаў, бо сёлета гарбузовы ўраджай у Юркевічах быў надзіва багаты.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Рынак працы

## ЧАМУ НЕ ІДУЦЬ У ТКАЧЫ?

### На «Камволі» не хапае 160 работнікаў

**Па статыстыцы, канкурэнцыя сярод саіскальнікаў на рынку працы зніжаецца: за год каэфіцыент напружанасці ўпаў з 1,1 да 0,5 беспрацоўнага на вакансію. І калі яшчэ нядаўна дзверы прадпрыемстваў ламаліся ад ахвотных, сёння на некаторых — дэфіцыт кадраў. На сталічным «Камволі» расказваюць: вакансій адкрыта мора — толькі прыходзьце.**

— За чатыры гады тут прайшла мадэрнізацыя. Ад старога прадпрыемства засталіся толькі сцены. Паставілі новае еўрапейскае абсталяванне — бельгійскае, італьянскае, нямецкае. Прадукцыйнасць шалёная! Таму неабходна трэцяя змена, — тлумачыць **намеснік генеральнага дырэктара «Камволя» па кіраванні персаналам і ідэалогіі Алена ПЛЯСКОВА**.

Рэканструкцыя ішла паралельна рабоце. З аднаго боку — катлаван, з другога — за станком працавалі людзі. Умовы былі вельмі цяжкія. Затое цяпер у цэхах цёпла, светла і прасторна.

— «Камволь» не той, які паказвалі па тэлебачанні ў 2012 годзе, — заўважае Алена Пляскова падчас экскурсіі па вытворчасці. — Усё стала кампактна, плошчы зменшыліся ў два разы.

Фабрыка перапрацоўвае воўну, сінтэтыку, віскозу. У цэхах у асноўным жанчыны: іх у штаце 75 працэнтаў. Мінулыя гады выпускалі да аднаго мільёна метраў тканіны, сёлета ўжо — два мільёны. Тут працуе таксама турэцкая кампанія, якая навучае беларускіх спецыялістаў новым тэхналогіям. Турцыя — у ліку перадавікоў на рынку тэкстылю, таму вопыт гэтай краіны заслугоўвае ўвагі.

СТАР. 4

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## У пошуках пажарных апавяшчальнікаў

**У Беларусі зараз праходзіць традыцыйная штогадовая акцыя «За бяспеку разам». Да сем'яў, дзе дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, інвалідаў і старых, якія жывуць адны, аматараў высокаградусных напояў, у шматдзетныя сем'і прыходзяць з прафілактычнымі мэтамі прадстаўнікі розных ведамстваў. Сярод іх — супрацоўнікі міністэрстваў па надзвычайных сітуацыях, унутраных спраў, аховы здароўя, тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнай абароны, газазабеспячальных арганізацый. Удзел у акцыі ўзялі карэспандэнты «Звязды», якія адправіліся ў Смалявіцкі раён.**

СТАР. 4



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# У планах — новыя праекты

## Беларусь і ААЭ будуць паглыбляць супрацоўніцтва

**Прэзідэнт нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 5 лістапада правёў перагаворы з Наследным прынцам Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Як паведаміла прэс-служба беларускага лідара, бакі абмеркавалі стан і перспектывы развіцця беларуска-эмірацкіх адносін.**



Фота БЕЛТА.

«Вельмі важная сфера двухбаковых адносін. Мінулы раз мы дамовіліся па шырагу напрамкаў супрацоўніцтва, і гэтыя напрамкі мы разам з эмірацкім бокам спрабуем развіваць», — сказаў кіраўнік нашай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што сустрэчы з Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам заўсёды праходзяць у сяброўскім рэчышчы, падзякаваў за цёплы прыём у ААЭ. Прэзідэнт адзначыў, што ў беларускай дэлегацыі атрымалася азнаёміцца з развіццём цэлага шэрагу галін у гэтай краіне. «Павінен адкрыта сказаць, што мы ў вас гэтым разам многае пагледзелі. Ад сферы турызму да найлепшых узораў аховы здароўя. І я ўдзячны за тое, што вы па-братэрску, шчыра адчынілі нам дзверы ў любы дом, у якім мы хацелі пабываць. І перш за ўсё той шпіталь, які мы наведалі. Ён наогул нас уразіў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Што да двухбаковых адносін, лідары краін дамовіліся, што ААЭ павінны быць яшчэ шырэй прадстаўлены ў Беларусі. Бакі прапрацуюць варыянты яшчэ некалькіх магутных праектаў, якія яшчэ больш цесна ў плане эканомікі звяжуць дзве дзяржавы. Адзначана, што дынаміка ў развіцці адносін добрая, і яе неабходна падтрымліваць і памнажаць.

Кіраўнік нашай дзяржавы падарыў Наследнаму прынцу Абу-Дабі дэкаратыўнае пано «Залаты арол», выкананае з выкарыстаннем дрэва і тэхналогіі чаканкі, і ўсходнюю шаблю.

■ Вышэйшая адукацыя

# У пошуку алмазаў негранёных

## На канікулярным тыдні школьнікі сталі «студэнтамі» Акадэміі кіравання

**На працягу чатырох дзён галоўная альма-матэр кіраўнікоў розных узроўняў ажыццяўляла праект «Восеньская школа кіравання. Лесвіца поспеху». У яго рамках трыццаць школьнікаў адчулі сябе паўнавартаснымі студэнтамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

Рэктар Марат Жылінскі, кажучы пра асноўныя мэты праекта, адзначыў: «Па-першае, мы арыентуемся на тое, каб сабраць у добрым сэнсе залатую моладзь, каб ужо зараз пачаць работаць з матываванымі і таленавітымі людзьмі. Калі вобразна, наша задача — знайсці гэтыя маленькія алмазы і ператварыць іх у сапраўдныя брыльянты. Па-другое, вельмі важна даць магчымасць будучым студэнтам паглядзець на тое, што ўяўляе сабой не толькі Акадэмія, але і ўвогуле сістэма вышэйшай адукацыі. Трэцяя мэта — гэта развіццё адпаведных навыкаў, таму што ў нашай установе мы чакаем людзей, якія будуць мець не толькі багаж ведаў, але яшчэ і пэўныя схільнасці да кіравання. Ну і зразумела, што гэта будзе вельмі эфектыўная рэклама нашай установы, калі ўдзельнікі праекта будуць дзяліцца са сваімі сябрамі, аднакласнікамі менавіта тым, што яны бачылі на свае вочы, што самі адчувалі, і школьнікі будуць атрымліваць жывую і адаптаваную пад іх інфармацыю пра Акадэмію».



«Восеньская школа кіравання» з'яўляецца пілотным праектам, таму сёлета прыняць удзел у ім мелі магчымасць толькі жыхары сталіцы. Але, як было адзначана рэктарам, геаграфія мерапрыемства будзе пашырацца і неўзабаве ахопіць усю тэрыторыю краіны.

У першы дзень удзельнікам выдалі часовыя студэнцкія білеты. У праграме «Восеньскай школы кіравання» былі прадугледжаны розныя кшталту інтэрактывы: трэнінгі, майстар-класы і дзелавыя гульні, прафесійна-псіхалагічнае тэсціраванне, індывідуальная гутарка, круглы стол з членамі студэнцкага актыву, дзе адбылася прэзентацыя спецыяльнасцяў, і сустрэча з арганізатарамі праекта.

Адметным мерапрыемствам стаў выязны занятак на базе Генеральнай пракуратуры. Удзельнікі праекта пазнаёміліся з сістэмай і сутнасцю дзейнасці пракуратуры, у размове з **генеральным пракурорам Аляксандрам КАНЮКОМ** закранулі такія вострасацыяльныя тэмы, як праблемы наркаманіі, злачынстваў сярод дзяцей і падлеткаў, прафанацый і правакацый у СМІ. Таксама генеральны пракурор расказаў пра свой кар'ерны шлях і даў некалькі карысных парад будучым абітурыентам наконт здачы экзаменаў і выбару прафесіі. «Такія сустрэчы, безумоўна, вельмі эфектыўныя. Самае прыемнае, што інтэлектуальная эліта моладзі наведвае мерапрыемствы такога роду і разглядае як варыянт працу ў гэтай сферы», — заўважыў Аляксандр Канюк. Ён паабяцаў не толькі спрыяць арганізацыі падобных сустрэч, але і выступаць іх непасрэдным ініцыятарам, а таксама запрасіў удзельнікаў размовы да сябе на лекцыю.

У апошні дзень праграмы студэнтам-школьнікам выпала магчымасць пабываць у галоўным офісе кампаніі «Wargaming», якую Акадэмія кіравання забяспечвае кадрамі ў сферы кіравання інфармацыйных рэсурсаў. Была праведзена экскурсія па дванаццаціпавярховым будынку: школьнікі наведалі рабочыя памяшканні, пакоі адпачынку, трэнажорную залу, Алею славы, кабінет, прысвечаны «Бітлз», і шмат чаго яшчэ. Кажуць, што калі ў офіс «Wargaming» прыходзяць на экскурсію групы, пытанне, якое задаюць найчасцей, — гэта «А як тут у вас можна непрыкметна згубіцца, каб застацца?» Удзельнікі праекта выключэннем не сталі.

Завяршальнай падзеяй «Восеньскай школы кіравання» стала сустрэча з рэктарам Маратам Жылінскім, дзе былі падведзены вынікі тыдня і ўручаны сертыфікаты ўдзельнікам праекта.

**Аляксандра ДАРАШЭНКА**

■

# Каля 1000 заканадаўчых актаў

## Падрыхтаваў Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў

**Такі вынік падвялі на святкаванні 20-годдзя цэнтра. «Па іх (законах. — Аўт.) будуць жыць нашы дзеці, нашы ўнукі. І нам не сорамна за сваю працу», — адзначыў дырэктар НЦЗПД Вадзім ІПАТАЎ. Ён падкрэсліў, што калектыў фарміраваўся на падставе трох пазіцый: прафесіяналізм, кампетэнтнасць і адданасць сваёй справе. І гэтыя пазіцыі захоўваюцца.**

Сёння цэнтр займаецца падрыхтоўкай праектаў законаў, ажыццяўляе метадычнае кіраванне заканатворчай дзейнасцю, праводзіць навуковыя даследаванні. Павіншаваць супрацоўнікаў прыйшоў і былы дырэктар, а цяпер **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МІЦКЕВІЧ**. Ён лічыць, што калектыў цэнтра ўнікальны: «Скласці маладосць і вопыт — гэта няпростая задача. І гэта на выхадзе дало вельмі сур'ёзны эфект. Вы падбіраеце самых лепшых выпускнікоў, потым яны ўжо ператвараюцца ў вопытных спецыялістаў і навучаюць тых, якія зноў прыйшлі, — гэта дало свой плён».

Павіншаваць калектыў прыйшлі таксама намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслаў Пірштук і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ТЭЛЕФОН НЕ ЗМАЎКАЎ

## Старшыня Мінгарвыканкама адказаў на пытанні мінчан

**Большая частка зваротаў датычылася жыллёвай сферы: будаўніцтва і зносу дамоў, а таксама адсялення іх жыхароў.**

Тэлефанавалі **мэру сталіцы Андрэю ШОРЦУ** і наконт ільготных крэдытаў і субсідый на ўзвядзенне жылля для розных катэгорый грамадзян, у прыватнасці сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Не засталася без увагі і сфера ЖКГ: для хутчэйшага вырашэння праблемных пытанні былі перанакіраваныя ў раённыя адміністрацыі. Усяго мясцовым органам улады паступіла 44 пытанні для разгляду.

Цікавіла мінчан не толькі будаўніцтва новага жылля, але і капітальны рамонт старога, напрыклад, магчымасць выявдзення батарэй са сцен пры правядзенні адпаведных работ. Адна са скаргаў датычылася шуму, які даносіцца са склепа шматкватэрнага дома з-за размешчанага там халадзільнага абсталявання гандлёвага аб'екта.

Кола пытанняў не абмяжавалася асобнымі дамамі, былі сярод іх і тыя, якія закранаі цэлыя населеныя пункты.

Старшыня Мінгарвыканкама запэўніў, што кожная сітуацыя будзе дасканала вывучаная, а на кожны зварот будзе дадзены адказ у рамках дзеючага заканадаўства. Увогуле за тры гадзіны прамой лініі было прынята 65 званкоў, пры гэтым зафіксавана каля 3 800 спроб датэлефанавацца.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ФБР расказала аб матывах тэхаскага стралка



Масавая стральба, якую ў нядзелю ўчыніў амерыканец Дэвін Келі ў адной з цэркваў штата Тэхас, не была абумоўлена ні расавымі, ні рэлігійнымі матывамі. На гэта злачынцу справакавалі сямейныя праблемы, паведамляе тэлеканал ABC News са спасылкай на ўрадавыя крыніцы.

Афіцыйны прадстаўнік ФБР заявіў, што «зараз справа не расследуецца як тэракт». Па інфармацыі выдання, на злачынства мужчына адправіўся пасля канфлікту са сваёй цешчай, якая таксама наведвала царкву, дзе адбылася страляніна. Напярэдадні, як паведамлялася, стралок з аўтаматам забіў па меншай меры 26 чалавек і параніў яшчэ дваццаць вернікаў царквы ў гарадку на поўдні амерыканскага штата Тэхас. Злачынца дзейнічаў у адзіночку. Апрануты ў чорную спецвопратку і бронекамізэльку, мужчына пад'ехаў да царквы ў мястэчку Сазерленд-Спрынгс і адкрыў агонь з парога. Потым ён зайшоў унутр і працягнуў страляць.

СМІ паведамляюць, што стралок — 26-гадовы Дэвін Патрык Келі. У 2012 годзе яго са скандалам звольнілі з ВПС ЗША. Трыбунал распачаў супраць яго справу за збіццё жонкі і дзіцяці і пазней прысудзіў да 12 месяцаў турмы. У 2014 годзе ён быў разжалаваны і звольнены з арміі. Па інфармацыі BBC, Дэвін Келі знік з месца злачынства на машыне. Пазней паліцыя знайшла яго мёртвым.

**У ЗША аб'яўлена чатырохдзённая жалоба. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту ЗША Дональду Трампу ў сувязі з трагедыяй у мястэчку Сазерленд-Спрынгс, якая прывяла да шматлікіх ахвяр. «Злачынства, учыненае ў царкве падчас нядзельнага набажэнства, абурае сваёй цынічнасцю, жорсткасцю і бессэнсоўнасцю», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ад імя беларускага народа і сябе асабіста Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні родным і блізкім загінулых, словы падтрымкі жыхарам Сазерленд-Спрынгс і ўсяму народу ЗША, а таксама пажадаў хутчэйшага выздараўлення параненым.**

## Расійскі гімн — на мяжы забароны на Алімпіядзе 2018

Расійскі гімн можа быць забаронены на зімовых Алімпійскіх гульнях — 2018 у Пхёнчхане. Пра гэта паведамляе The New York Times са спасылкай на крыніцы, знаёмыя з сітуацыяй. Адзначаецца, што расійскія спартсмены таксама могуць быць не дапушчаны да цырымоніі адкрыцця Гульняў. Такія санкцыі разглядаюць прадстаўнікі Міжнароднага алімпійскага камітэта (МАК) у якасці пакарання за парушэнні расійскімі антыдопінгавых правілаў на Алімпійскіх гульнях — 2014 у Сочы.

Чакаецца, што рашэнне па допуску зборнай Расіі да Гульняў-2018 будзе прынята на выканкаме МАК у пачатку снежня.

## 2017 год назвалі адным з трох самых гарачых за ўсю гісторыю назіранняў

Па падліках экспертаў Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі пры ААН, у студзені — верасні 2017 года глабальная сярэдняя тэмпература ўтрымлівалася прыкладна на паўградуса вышэй, чым у 1981—2010 гадах. Пры гэтым у цэлым шэрагу рэгіёнаў свету, у тым ліку ў азіяцкай частцы Расіі, была зафіксавана рэкордна высокая тэмпература.

Самым гарачым годам у гісторыі назіранняў, як вынікае з прагнозу СМА, застанецца пакуль 2016 год, калі на клімат планеты аказала ўплыў такая з'ява, як Эль-Ніньё (пад гэтай назвай разумеецца значнае ваганне тэмпературы паверхневага пласта вады ў экватарыяльнай частцы Ціхага акіяна).

«Мабыць, 2017 год стане самым цёплым годам у гісторыі назіранняў, які не падпаў пад уздзеянне з'явы Эль-Ніньё. Сярэдняе значэнне тэмператур за пяцігадовы перыяд (2013—2017 гадоў), па папярэдніх даных, на 0,4 °С вышэйшае за сярэдняе значэнне за перыяд 1981—2010 гадоў і прыкладна на 1,03 °С вышэйшае за паказчык даіндустрыяльнага перыяду. Відаць, ён стане самым гарачым у гісторыі назіранняў», — гаворыцца ў дакладзе СМА. Генеральны сакратар СМА Петэры Таалас адзначыў, што доўгатэрміновая тэндэнцыя да падвышэння тэмпературы на планеце суправаджаецца ростам колькасці небяспечных прыродных з'яў.

«Мы сталі сведкамі незвычайнага надвор'я, уключаючы тэмпературы, якія перавышаюць 50 градусаў па Цэльсію ў Азіі, рэкордныя ўраганы ў Карыбскім басейне і Атлантыцы, якія дасягнулі берагоў Ірландыі, разбуральныя мусонныя паводкі, якія аказалі ўздзеянне на жыцці многіх мільёнаў людзей, і страшную засуху ва Усходняй Афрыцы», — растлумачыў Таалас.

Раней СМА паведаміла, што канцэнтрацыя вуглякіслага газу ($CO^2$) у атмасферы Зямлі дасягнула самага высокага за апошнія 800 тысяч гадоў узроўню.

# Залп «Аўроры», рэвалюцыйны квэст і 50 гадзін марафону

### Удзельнікі «Школы выжывання» прайшлі складанымі маршрутамі на Аўгустоўскім канале

**У міжнародным марафоне прынялі ўдзел больш за 50 спартсменаў з Беларусі і Украіны. Яны павінны былі пераадолець каля 100 кіламетраў дыстанцыі, якая праходзіла па складаных мясцінах ландшафтнага заказніка «Гродзенская пушча», фартыфікацыйных аб'ектах «Лініі Молатава», праплыць праз Аўгустоўскі канал.**

**По словах галоўнага суддзі спаборніцтваў Сяргея КАЛЯДЫ**, гэта свайго роду паход, у якім дэманструюцца здольнасці па выжыванні ў экстрэмальных умовах, уменне пераадольваць цяжкасці і перашкоды, навыкі па выратаванні. Дадаткова сёлета ў праграму быў уключаны квэст на веданне рэвалюцыйных падзей, звязаных з горадам Гродна. Удзельнікі марафону шукалі па карце будынак, які наведваў Фелікс Дзяржынскі, адказвалі на пытанне, колькі гадоў кінатэатру «Чырвоная Зорка». Заданні раздаў сам правадыр рэвалюцыі Уладзімір Ленін (яго вобраз увасобіў адзін з арганізатараў).

Асноўныя спаборніцтвы пачаліся на шлюзе Нямнова Аўгустоўскага канала. Першым выпрабаваннем сталі пад'ём па крутым схіле разам з «параненым» членам каманды і аказанне яму першай дапамогі. Затым былі больш складаныя этапы — начлег у лесе, пошук ежы, дабыча агню, выратаванне тапельца, пераходы па балоцістай мясцовасці.

— Многія ўдзельнікі маюць добрую падрыхтоўку і навыкі выжывання ў экстрэмальных умовах, — адзначыў Сяргей Каляда. — Спаборніцтвы дапамагаюць падтрымліваць добрую форму і рыхтаваць у школе выжывання новых «вучняў», якія змогуць дапамагаць пры выратавальных работах падчас разгулу стыхій ці шукаць зніклых у лесе людзей.

Найбольш складанымі, па словах арганізатараў, стала водная пераправа цераз Чорную Ганчу і ўмоўнае выратаванне чалавека,



Фота БЕЛТА

які ўпаў у расколіну. Гэты этап праходзіў на першым форце Гродзенскай крэпасці. Таксама ўдзельнікі спаборнічалі ў пошуках дотаў «Лініі Молатава». Перавозілі ўдзельнікаў каманды на другі бок канала на «Аўроры». Пад легендарны крэйсер «загрыміравалі» цеплаход «Нёман», з якога прагрымеў залп з пушкі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# Абноўлены дзіцячы сад і выпушчана тэматычная марка

### Як у сталіцы адзначылі Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі

**У Мінску да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі прымеркавалі адкрыццё абноўленага ясляў-сада ў Заводскім раёне. У памяшканні правялі капітальны рамонт, рэканструявалі басейн, які быў закрыты, акрамя таго, абнавілі і прылеглую тэрыторыю: памянялі асфальт, усталявалі новыя веранды, тратуарныя дарожкі, гарадок бяспекі і спартыўную пляцоўку. Установа адукацыі разлічана на 170 месцаў, ужо сфарміравана 9 груп.**


Фота БЕЛТА.

Да юбілейнай даты РУП «Белпошта» выпусціла паштовую марку «100 гадоў Кастрычніцкай рэвалюцыі» накладам 42 тысячы асобнікаў — яе гашэнне адбылося напярэдадні свята ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Д. Шчамялёва, пасля чаго яна была выпушчаная ў абарачэнне. За некалькі дзён да ўрачыстасці ў Палацы рэспублікі прайшоў тэматычны канцэрт, а 7 лістапада адбылася цырымонія ўскладання вянкоў і кветак да помніка Уладзіміру Леніну на плошчы Незалежнасці. У мерапрыемстве прынялі ўдзел некалькі сотняў чалавек, сярод якіх лідары і члены Камуністычнай партыі Беларусі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Мінгарсавета, прадстаўнікі Мінгарвыканкама, прафсаюзных, ветэранскіх і маладзёжных арганізацый, працоўных калектываў.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# Нашчадкам: з 1960-х і з 2010-х

**У Полацку, самым старажытным горадзе краіны, напярэдадні 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ўскрылі капсулу з пасланнем — нам, і заклалі восем — нашчадкам — ад імя моладзі.**


Фота БЕЛТА.

**Ганаровая місія ўскрыць капсулу з завяшчаннем была ўскладзена на кавалера трох ордэнаў Славы Анатоля ДЗЯМ'ЯНАВА *(злева)* — аднаго з тых, хто прымаў удзел у стварэнні Кургана Бессмяротнасці 50 гадоў таму. Справа — дэпутат Полацкага раённага Савета дэпутатаў Анатоль ЛІТВІНЕНКА.**

Гарадская патрыятычная акцыя «Нам працягваць гісторыю горада!» з ускрыццём капсулы, якая была закладзена 8 чэрвеня 1966 года, адбылася ў падножжа Кургана Бессмяротнасці.

Палачане 60-х звярталіся да тых, хто ўскрые ліст у дні 100-гадовага юбілею Кастрычніцкай рэвалюцыі: «Ля падножжа гэтага дзесяціметровага Кургана, насыпанага рукамі жыхароў Полацка, мы кладзём наша завяшчанне патомкам разам з часцінкай свайго сэрца і палымяным заклікам: ніколі не забывайце гераічнага мінулага Савецкага народа. Заўсёды памятайце, якой цаной дасталася шчасце свабоды вашым дзядам, бацькам і братам! Беражыце яе як зрэнку вока!

Дарагія сябры! 50 гадоў аддзяляюць нас ад таго часу, калі вы ўскрыеце гэта завяшчанне. Можа быць, не ўсе з тых, хто прысутнічае пры яго прыняцці, змогуць прачытаць яго разам з вамі, але нябачна мы будзем усе разам і разам з вамі будзем радавацца дасягненням і поспехам нашай Радзімы, нашым перамогам, ганарыцца тымі перапўтварэннямі, якія здзейсніцца за гэтыя гады на зямлі старажытнай Полаччыны, як радуемся і ганарымся мы цяпер, аглядаючы пройдзены нашай краінай і савецкім народам гераічны баявы і працоўны шлях...»

Аўтары паслання нагадалі нам, што ўсяго толькі каля 20 гадоў аддзяляюць іх ад Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Далей канстатуюцца дасягненні савецкага народа:

«А як змяніласе за гэты час аблічча нашай Радзімы! Краіна тысяч новабудоўляў, пераможца Космасу (менавіта з вялікай літары напісалі гэта слова. — **Аўт.**), краіна самай перадавой у свеце сацыялістычнай дзяржавы, краіна людзей-працаўнікоў, людзей-пераможцаў — восьякой паўстане яна перад намі ў пярэдадзень свайго пяцідзесяцігоддзя...».

Пяцьдзясят адзін год таму жыхары Полацка ў сваім зваротае будучаму пакаленню падкрэслілі, што за параўнальна нядоўгі час фактычна з руін аднавілі горад. Яны прасілі памятаць тых, хто загінуў пры вызваленні роднай зямлі ад ворага.

Завяршаецца тэкст такімі словамі: «Перад вамі — шырокая дарога. Ідзіце па ёй смела і цвёрда да новых дасягненняў камунізму, як ішлі вашы дзяды і бацькі. Будзьце дастойныя іх даверу!»

Нашы сучаснікі падхапілі эстафету і напісалі новае пасланне, якое накіравалі на 50 гадоў наперад. Аўтары аднаго з лістоў — 9-класніца СШ №3 г. Полацка Валерыя Фіялка і 11-класніца СШ №18 імя Ефрасінні Полацкай Ала Рубан. Напэўна, не варта поўнасцю цытаваць тэкст — няхай інтрыга захаваецца да 2067 года. Але прывяду некалькі характэрных фраз.

«Гэты горад незвычайны. Ён адзін з самых старажытных на тэрыторыі Беларусі, і разам з тым ён стаў маладзёжнай сталіцай нашай краіны ў 2017 годзе. Ён горад-загадка, які шмат бачыў, шмат ведае, але не спяшаецца выдаваць свае таямніцы. Полацк — адначасова і калыска беларускай духоўнасці, і сучасны цэнтр Еўропы. Полацк невялікі па памерах, але ён велічны сваімі людзьмі і гісторыяй. Адлегласць ад Сафійскага сабора да Кургана Бессмяротнасці вымяраецца не кіламетрамі, а эпохамі...» — без перабольшання геніяльныя радкі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# Усклалі кветкі, праспявалі песні

**Да помніка Леніну ў Брэсце прыйшло ўчора каля сотні чалавек. Трэба адзначыць, што гэта нашмат больш, чым у мінулыя гады. У асноўным сабраліся людзі старэйшага пакалення. Яны ўсміхаліся, віншавалі адно аднаго са святам, фатаграфаваліся. Некаторыя прынеслі з сабой чырвоныя сцягі і рэвалюцыйныя плакаты.**

Мітынгу не было, ахвотныя гаварылі колькі слоў і ўскладвалі кветкі да помніка правадыру рэвалюцыі. Потым удзельнікі акцыі заспявалі некалькі песень рэвалюцыйнай тэматыкі і сталі разыходзіцца.

А напярэдадні ў Брэсце ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылі мемарыял «Героям — вартавым мяжы». Помнік адрэвалі на рэканструкцыю прыкладна паўтара года таму. Манумент быў адкрыты ў 1972 годзе ў гонар пагранічнікаў, якія загінулі на перадавых рубяжах у першыя дні вайны. І вось прыйшла чарга яго абнавіць, што і было паспяхова зроблена за кошт гарадскога бюджэту. **Старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** сказаў на цырымоніі адкрыцця мемарыяла, што ў


Фота БЕЛТА.

Брэсце заўсёды помняць і шануюць вартавых мяжы, якія з гонарам выканалі свой воінскі абавязак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# Капсула часу ўскрыта, капсула часу закладзена

**У чырвоны колер расквецілі лістапад, які ўжо стаціў лісце, удзельнікі гістарычнай рэканструкцыі, праведзенай у стагоддзе Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Гомелі.**

Імітацыя падзей з захопам палаца Румянцавых і Паскевічаў адбылася ў цэнтральным парку горада над Сожам і сабрала некалькі соцен чалавек. Частка з іх выйшла пад чырвонымі сцягамі сучаснай Камуністычнай партыі, частка — з рэтра-транспарантамі, а большасць — проста для таго, каб зрабіць цікавае сэлфі з рарытэтнымі машынамі і людзьмі, апранутымі ў гістарычную ваенную форму.

Дарэчы, стагоддзе таму захоп улады бальшавікамі менавіта ў Гомелі абышоўся без кровапраліцця, але ж для больш тэатралізаванасці ўдзельнікі ваенна-гістарычнага клубнага аб'яднання «Гонар мундзіра» правялі перастрэлку халастымі сярод старажытных дрэў парку Паскевічаў, многія з якіх сапраўды бачылі ўдзельнікаў рэвалюцыйных падзей 1917 года.

Асноўныя сёлетнія мерапрыемствы ў Гомелі між тым разгорталіся ад парку Фестывальны, дзе паўстагоддзя таму быў узведзены курган Славы — у гонар 50-годдзя савецкай улады і для ўвекавечання памяці воінаў Чырвонай Арміі, партызан, загінулых за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы ў 1941—1945 гадах.



Традыцыяй 1967 года была паўсюдная закладка капсул з наказам нашчадкам. У Гомелі каля такой пліты пры падножжы кургана паўстагоддзя гарыць вечны агонь. Дастаць ёмістасць з тэкстам было завешчана якраз на 100-годдзе рэвалюцыі, што і зрабілі дапытлівыя носьбіты традыцый. Пакуль музейныя супрацоўнікі будуць рэстаўраваць новы адрыты артэфакт, у газетных архівах, вядома, знайшлі тэкст, прызначаны для прачытання. У ім, прынамсі, ёсць такія словы:

«Беражыце родную нашу Айчыну, свяшчэнную зямлю, якую адстаялі і зберaглі для нас продкі. Свету — мір, дружба — народам, шчасце — для ўсіх людзей зямлі. Капсула закладзена 26 кастрычніка 1967 г. у 11.30».

Яшчэ праз 50 гадоў будзе нагода ў нашых нашчадкаў сабрацца і ўскрыць грунт. Новая капсула са зваротам у будучыню цяпер зарыта на плошчы Леніна ў падмурку помніка правадыру камуністычных ідэй. Права яе апусціць у зямлю было дадзена старшыні гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Івану Барадзінчыку і кіраўніку спраў Гомельскага аблвыканкама Алене Клічкоўскай.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# У пошуках... апавяшчальнікаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Цяжэй за ўсё працаваць з тымі, хто злоўжывае спіртным, а таксама з адзінокімі старымі, — кажа **выконваючы абавязкі начальніка Смалявіцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр МЯДЗЕЛЬ.** — На жаль, тут сваю ролю адыгрывае псіхалогія. І калі з першымі ўсё зразумела, то старыя, у якіх няма ні дзяцей, ні тым больш унукаў, кажуць напрамую: ды я тут проста дажываю сваё. За столькі гадоў нічога не здарылася, чаму менавіта павінна адбыцца са мной? Вось толькі тады, калі ў атаку пойдзе «чырвоны певень», нешта рабіць будзе ўжо позна. Хоць можна заўжды звярнуцца па дапамогу ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва...

Калі ж маладое пакаленне з'ехала ў іншы населены пункт, то ратавальнікі дасылаюць лісты, каб дзеці прыехалі да сваіх бацькоў і дапамаглі ім вырашыць праблемы, звязаныя з бяспекай жылля. Часцей за ўсё пытанні ўзнікаюць да стану печы і праводкі. Яно і зразумела: адрамантаваць іх каштуе даволі істотных грошай, якія ў старога могуць знайсціся ў адначасе не заўжды. Наступным разам ратавальнікі прыходзяць у гэты дом прыкладна праз месяц. І вынік дапамогі, як здаецца, навідавоку. Толькі што ж замінае зрабіць гэта дзецям самастойна, без лішніх нагадванняў?

## «Аналізатар чаднага газу ўратаваў жыццё бацькам мужа»

Тым часам мы кіруемся ў адносна новы раён Смалявіч. Прыгожыя пяціпавярховікі былі пабудаваны 5—6 гадоў таму. Іх «фішка» ў тым, што ў кожнай кватэры ўсталяваны газавы катлы. З аднаго боку, гэта добра — ты не залежыш ад зношаных цепламагістраляў і сярэднястатычнай тэмпературы «за бортам» у 8 градусаў цяпла на працягу пяці дзён, якая дае дабро на ўключэнне ацяплення ўвосень. А з іншага — вымагае і больш клопатаў аб бяспецы.

На чацвёртым паверсе пражывае шматдзетная сям'я Котавых. Дзверы адчыняе гаспадыня з малым на руках.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Дзіця, якому менш за месяц, салодка спіць, і мы стараемся не шумець.

Праглядваем усе пакоі. Адкрытай праводкі ў новых пабудовах няма. Газавы кацёл таксама прайшоў перад пачаткам халадоў тэхнічны агляд. І ў кожным пакоі нам падміргвае аўтаномны пажарны апавяшчальнік.

— Трымайце памятку, — кажа Аляксандр Мядзель. — У нас у рэспубліцы пачасціліся выпадкі выбуху катлоў. Ужо некалькі выпадкаў было з пачатку года. Таму чытайце рэкамендацыі. З кватэрамі, праўда, у нас праблем меней, чым з прыватнымі дамамі. Разеткі ўсе спраўныя?

— Так.

— А нешта я на кухні не бачу ў вас пажарнага апавяшчальніка...

— Вось ён, — здымае белы пластмасавы кругляк з шафы гаспадыня. — Прычым ён рэагуе не толькі на дым, але і на чадны газ.

— А дзе вы яго знайшлі? У газавіку? Проста ў Смалявіцкім раёне я яшчэ не бачыў камбінаваных апавяшчальнікаў...

— Не, муж набыў на Aliexpress. Замова была зроблена пасля выпадку ў Барысаве, калі чадным газам атруціліся людзі ў некалькіх кватэрах шматпавярховіка. Мы заказалі адтуль некалькі такіх прыбораў. Адзін з іх муж паставіў сваім бацькам, якія жывуць у прыватным доме, дзе ёсць і газавы кацёл, і печка. Неяк яны раней часу зачынілі комін, і чадны газ пайшоў у хату. Апавяшчальнік пачаў гучна пішчаць, і старыя прахапіліся своечасова ад сну...

— Але вы яго лепш прыкруціце на сценку каля самай століі, каб не псаваць рамонт. Чаму мы гэта раім? У канструкцыі любога апавяшчальніка ёсць спецыяльныя дзіркі на корпусе. З іх дапамогай датчык і рэагуе на небяспеку. Але калі апавяшчальнік проста ляжыць, то праз гэтыя дзіркі ўнутр будзе набівацца пыл, што не самым лепшым чынам паўплывае на датчык...

## «Дзеці з прыборам пагулялі»

Аўтаномны пажарны апавяшчальнік сілкуецца ад спецыяльнай батарэйкі тыпу «Крона». Хапае яе, як правіла, на 6—12 месяцаў работы. Калі ж рэсурс батарэі падыходзіць да канца, то апавяшчальнік пачынае пра гэта паведамляць кароткім піскам. І людзі пачынаюць здымаць прыборы. Хоць усяго толькі трэба схадзіць у найбліжэйшую краму гаспадарчых тавараў. Або замовіць новую батарэйку з дапамогай тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Было б жаданне...

— Быў забаўны выпадак у адной сям'і, — кажа Аляксандр Мядзель. — Яна пражывае ў двухкватэрным прыватным доме. Дзе жыве маці з дзецьмі — там абстаноўка яшчэ больш-менш прымальная. А вось бабуля любіць выпіць. І калі ў яе нешта здарыцца, то без даху над галавой застанецца ж уся сям'я!

Дык вось, паставілі мы бабулі апавяшчальнік. Праз некаторы час прыходзім — апавяшчальніка няма. Пытаемся: бабуля, куды падзелі апарат? Старая адказвае: ды вунь ён, ляжыць на шафе. Інспектар узяў прыбор у рукі, правярыць батарэйкі, і ён здаўся яму нейкім падазрона лёгкім. А ад апарата засталася толькі адна накрыўка... Бабуля тлумачыла, што дзеці з ім пагулялі. Цяпер сям'я паставіла два апавяшчальнікі. Засталося толькі дамагчыся, каб старая ізалявала праводку і адрамантавала печ.

## «А ў нас страхоўка ёсць!»

Мы кіруемся ў пасёлак Зарэчча. Там таксама жыве некалькі шматдзетных сем'яў. Але гэтым разам ужо не ў шматкватэрных дамах, а ў прыватных.

У доме сям'і Сухенка адразу бачна цвёрдая гаспадарская рука. Але пільны выконваючы абавязкі начальніка і тут знайшоў некаторыя прафілактычныя хібы.

— А ці прыязджалі сёлета да вас з газавай службы? — пытаецца Аляксандр Мядзель. — Ці абслугоўвалі кацёл перад ацяпляльным сезонам?

— Дык у нас кацёл імпартны, яны і не даязджалі да нас... — адказвае задуменна гаспадыня.

— Усе газавыя катлы павінны правярацца, асабліва перад ацяпляльным перыядам. Вось як у шматкватэрных дамах правяраюць вентыляцыйныя каналы. Таму патэлефануйце ў газавую службу. Лішнім не будзе. А ці ёсць у вас апавяшчальнікі? Нешта я іх не ўбачыў.

— Няма...

— Як жа так? Пастаўце абавязкова, хоць бы на кухню, у дзіцячы пакой і ў спальню. Іх можна набыць або ў пасялковай краме, або ў Смалявічах тут непадалёк.

— Так, трэба прыкруціць у пакоі старэйшага хлопчыка, — пагаджаецца гаспадыня. — Быў ужо ў нас непрыемны выпадак з ім узімку. Запалкі паліў у сваім пакоі. Спачатку нават падалося, што там нейкая здань арудуе. На шчасце, запалкі паспелі адабраць. І яму ж шэсць год усяго!

Апавяшчальнікаў мы не ўбачылі і ў наступным доме. Хоць з усім астатнім рыштункам усё было ў парадку. Гаспадыня зазначыла, што дом застрахаваны. Аднак хіба дапаможа адна толькі страхоўка, калі пажар у доме ўзнікне дзесьці ўначы і ўсе будуць спаць салодкім сном? У сне ж чалавек пахі не адчувае. І таму стаўкай за ігнараванне такога простага і таннага прыбора можа быць жыццё...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# ЧАМУ НЕ ІДУЦЬ У ТКАЧЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер чакаюць новы асартымент. Тканіны «Камволь» пастаўляе ў Расію, Польшчу, Азербайджан, Арменію, Казахстан. Раней прадпрыемства мала працавала на спажывецкі рынак (усё ў асноўным збывалася на вытворчасці), а цяпер прадае сваю прадукцыю ў крамах.

Пасля мадэрнізацыі думалі, што штат давядзецца сціснуць. Але не спатрэбілася. Па словах намесніка гендырэктара, сёння не скарачаюць нікога. Сыходзяць толькі пенсіянеры, якія не працягнулі кантракт па ўласным жаданні. Сярэдні ўзрост на прадпрыемстве — 44 гады (у 2013-м быў 47). 235 работнікаў — да 31 года (усяго ў штаце працуе каля 730 чалавек). Апошнія чатыры гады ёсць станоўчая тэндэнцыя па павышэнні замацавання маладых спецыялістаў. Сёлета, дарэчы, на «Камволь» прыняслі 26 выпускнікоў: ткачоў, распрацоўшчыкаў дызайну тканіны, аддзелачнікаў, маркетолагаў.

— Пастаўлена мэта, каб усе асноўныя рабочыя атрымлівалі 2—3 прафесіі, — дадае Алена Пляскова.

Пасля ўводу трэцяй змены фабрыцы не хапае на пастаянную работу яшчэ 160 чалавек. Аператары матальнага, стрыгальнага, роўнічнага абсталявання, вузлавязальных машын, аператары хімстанцыі (рыхтуюць фарбавальныя растворы), прадзільшчыкі, чысцільшчыкі тканіны (убіраюць вузлы, патаўшчэнні на палатне), рэстаўратары гатовай прадукцыі, памочнікі майстра... Заробкі — 450—650 рублёў. Ткачам гатовы плаціць 700 рублёў у месяц. Уладкавацца можа нават чалавек без належнага вопыту і адукацыі: на прадпрыемстве арганізуюць навучанне. Прафесіі знаходзяцца ў ільготным спісе па пенсійным забеспячэнні — праз шкодныя ўмовы (пыл, шум) работнікі выходзяць на заслужаны адпачынак на пяць гадоў раней за агульнаўстаноўлены ўзрост.

— Усім іншагароднім даём месца ў інтэрнаце, — расказвае пра сацпакет намеснік гендырэктара. — Маладым сем'ям і спецыялістам з вышэйшай адукацыяй — асобныя пакоі. Сем'ям з двума дзецьмі выдзяляем дадатковы пакой. Такое рэдка дзе ёсць. Чарга ў інтэрнат невялікая, каля 80 чалавек. А быў час, калі яна складала пад 600 чалавек.

З 2010 года прадпрыемства здало ў эксплуатацыю два жылыя дамы для сваіх работнікаў: на 102 і 135 кватэр. Цяпер збіраюцца рэканструяваць пад дом адзін з інтэрнатаў.

Каб прыцягнуць кадры, «Камволь» сумесна з мінскай службай занятасці праводзіць шэраг мерапрыемстваў. Так, заўтра на вуліцы Шчарбакова, 32 з 10.00 да 12.00 арганізуецца міні-кірмаш прадпрыемстваў. 13 лістапада ў 10.00 бесплатныя экскурсіі на самой фабрыцы (вуліца Маякоўскага, 176), каб азнаёміць з умовамі працы. А 15 лістапада з 10.00 да 12.00 па гэтым жа адрасе, на Маякоўскага, «Камволь» правядзе кірмаш вакансій.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## Фінансы

# РЭЗЕРВЫ ВЫРАСЛІ НА 129 МЛН ДОЛАРАЎ

**Золатавалютныя рэзервы Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду на 1 лістапада склалі 7,395 млрд у эквіваленце. Пра гэта паведамляюць в ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

Толькі за кастрычнік сёлета золатавалютныя рэзервы выраслі на 128,6 млн долараў (на 1,8%) пасля росту ў верасні 2017 года на 273,1 млн долараў (3,9%). За студзень — кастрычнік прырост рэзерваў склаў 2 млрд 468,1 млн долараў (50%). Павелічэнню міжнародных рэзервовых актываў у кастрычніку спрыяла паступленне замежнай валюты ў бюджэт, уключаючы сродкі чарговага траншу крэдыту Еўразійскай фонду стабілізацыі і развіцця, экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.

У 2016 годзе золатавалютныя рэзервы Беларусі павялічыліся на 751 млн долараў (на 18%) — да 4 млрд 927,2 млн долараў (у эквіваленце) на 1 студзеня 2017 года.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Надвор'е

# Амаль суцэльная воблачнасць і дажджы

**Сапраўды восеньскае надвор'е чакаецца ў нас на гэтым тыдні. Дажджы будуць чаргавацца з туманамі, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Невялікія дажджы прагназуюцца ў асобных раёнах Беларусі ў сераду. Сёння ўдзень будзе воблачна з праясненнямі. Месцамі чакаецца туман. Вецер прагназуецца слабы. Тэмпература паветра ў другой палове дня будзе 3—8 цяпла.

У чацвер дажджлівае надвор'е будзе паступаць у Беларусь з заходняй палавіны краіны. Тут працяглыя дажджы і плюс 6 — плюс 8 градусаў. А ў цэнтральным рэгіёне ў чацвер без дажджоў і толькі плюс 1 — плюс 3 градусы. Уначы на чацвер будзе ўвогуле холадна, тэмпература паветра амаль паўсюдна складзе ад нуля да двух градусаў цяпла. У пятніцу ізноў невялікі дождж. Пацяплее. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 2 да плюс 4 градусаў, а ўдзень — 4—7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Літаратурныя сувязі

# Напамін пра багатыя традыцыі

**Сёння ў пасольстве Вялікабрытаніі ў Беларусі пройдзе прэзентацыя кнігі вершаў паэтэсы з Беларусі Анастасіі Кузьмічовай «Кіты Беларусі», выдадзенай у Лондане ў перакладзе на англійскую мову.**

Для сённяшняга стану міжнародных літаратурных стасункаў падзея знакавая. Быў час, калі нават у Беларусі па-англійску, па-польску, на іншых мовах народаў свету выдаваліся творы сучасных пісьменнікаў. Найперш — народных пісьменнікаў Беларусі: Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Івана Чыгрынава... Праўда, і плеяда перакладчыкаў у нашай краіне на іншыя мовы была досыць прыкметная. Як і плеяда перакладчыкаў мастацкай літаратуры з замежных моў на беларускую. Хоць штосьці з беларускай літаратуры па-за межамі Беларусі выдаецца і цяпер. У Германіі — вершы Алеся Разанава. За апошнія гады двойчы выходзілі ў еўрапейскіх краінах кнігі Алеся Адамовіча. Па-ўкраінску выдаюцца казкі Алены Масла. Ведаюць у Кіеве і творы іншых сучасных беларускіх пісьменнікаў.

«Hertfordshire Press Ltd» — лонданскае выдавецтва, якое прадставіла англамоўнаму чытачу паэзію Анастасіі Кузьмічовай. Будзем спадзявацца, што ў кніжніках Вялікабрытаніі, якія сёлета досыць актыўна ўдзельнічалі ў традыцыйнай лютаўскай кніжнай выстаўцы-кірмашы ў Мінску, ёсць і іншыя планы для прадстаўлення беларускай літаратуры на англійскай мове.

**Сяргей ШЫЧКО**


БАНК РЕШЕНИЕ

Уважаемые вкладчики **ЗАО «Банк «Решение»**!

Информируем вас о том, что с **8 декабря 2017 г.** по вкладам (депозитам) для физических лиц в иностранной валюте, будут действовать новые условия в соответствии с приведенной ниже таблицей:

| *Наименование вклада* | *Действующая ставка, % год* | *Новая ставка, % год* | *По договорам, заключенным* |
|---|---|---|---|
| «Шкварка» 3 года | 3 | **2,5** | с 01.09.2014 до 19.05.2016 |
| «Мясцовая Шкварка» 3 года | 3 | **2,5** | с 21.05.2015 до 19.05.2016 |
| «Шкварка» 2 года | 3 | **2,5** | с 17.11.2015 до 13.06.2016 |
| «Формула успеха» 1 год | 3,2 / 3,5 | **2,5** | с 09.06.2016 до 30.10.2017 |
| "Формула успеха» 2 года | 3 / 4 | **2,5** | с 09.06.2016 до 19.07.2017 |
| «Online-решение» 12 мес. | 3,3 / 3,6 | **2,5** | с 17.04.2017 до 30.10.2017 |
| «Online-решение» 18 мес. | 3,5 / 3,8 | **2,5** | с 15.06.2017 до 30.10.2017 |
| «Online-решение» 24 мес. | 4 | **2,5** | с 15.06.2017 до 19.07.2017 |

По возникшим вопросам вы можете обратиться в контакт-центр Банка (465 – с мобильного, 8 801 100 33 33 – бесплатный номер для звонков с городского телефона).

Лицензия на осуществление банковской деятельности №14 от 08.06.2016 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100789114

# ХТО КІРУЕ СВЕТАМ?..

## Падведзены першыя вынікі «Лістапада»

**Нагадаем, што гэтымі днямі ў сталіцы праходзіць XXIV Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад». На розных пляцоўках адбываюцца паказы ігравога і дакументальнага кіно на любы густ. Уже падведзены вынікі конкурсаў нацыянальных кінашкол і фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік». Не абышлося і без цікавінак і адмысловых сюрпрызаў гэтага года.**


Аляксей АЙГА і Ансамбль 4'33'' 8 лістапада выступяць у Мінску.

Прыз «За найлепшы фільм конкурсу нацыянальных кінашкол» быў прысуджаны фільму «Вузы» Зоф'і Кавалеўскай. Яна прадстаўляе Польскую нацыянальную школу кіно, тэлебачання і тэатра ў Лодзі. Фільму «Возера» рэжысёра Дар'і Блахіной прысуджаны дыплом за праніклівую гісторыю жыцця ў суровых прыродных умовах чалавека, які захоўвае сілу духу і радасць жыцця. Гэты фільм створаны пры ўдзеле Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага інстытута кіно і тэлебачання. Фільм «У іншым свеце» рэжысёра Ганны Бедыньскай атрымаў дыплом за мастацкае ўвасабленне тэмы маральнага выбару і любові як самага важнага сэнсу жыцця — гэта Школа дакументальнага кіно і тэатра Марыны Разбежкінай і Міхаіла Угарава з Расіі.

Толькі-толькі сталі вядомыя і вынікі конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік». Прыз «Залаты «Лістападзік» за найлепшы фільм» атрымала карціна «Падарожжа Фані» Лолы Дуаён з Францыі. Прыз «За найлепшую дзіцячую ролю» атрымаў Сарэх Нур Мусаві з фільма «Повдых жыцця» іранскага рэжысёра Наргеса Абіяра — апошні атрымаў яшчэ і спецыяльны прыз журы «За найлепшую рэжысуру». Прыз «За найлепшую работу дарослага акцёра ў дзіцячым фільме» атрымаў Эктар Гарсія — гэта фільм «Крокі героя» рэжысёра Энры Рынкона з Калумбіі. Прыз сімпатый гледачоў «За найлепшы фільм для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі» атрымала стужка «Цім Талер, або Прададзены смех» рэжысёра Андрэаса Дрэзэна з Германіі.

Гэтымі днямі гледачы «Лістапада» змаглі ўбачыць унікальны адрэстаўраваны фільм. Стужку Барыса Барнета «Дом на Трубнай» прадставілі пад акампанемент Аляксея Айгі і Ансамбля 4'33''. Варта дадаць, што для «Лістапада» стала ўжо традыцыяй паказваць пад жывую музыку класічныя стужкі, створаныя на пачатку станаўлення кінематографа. Сёлета для такога паказу гэты фільм абралі ў сувязі са 100-годдзем Кастрычніцкай рэвалюцыі.

«Дом на Трубнай» — гэта адначасова сатырычная камедыя і «гісторыя Папялушкі» савецкай эпохі. У віхуру НЭПа трапляе дзяўчына-сялянка, якая прыбыла з роднай вёскі ў Маскву. Тут яна ўладкоўваецца хатняй гаспадыняй да ўладальніка салона-цырульні Голікава і яго жонкі. Дом на Трубнай, дзе даводзіцца працаваць Паранні (так завуць дзяўчыну), населены дзіўнымі героямі, якія жывуць у сваім уласным маленькім


Адна з узнагарод «Лістапада».

свеце, поўным мяшчанскай мітусні і плётак. Гаспадыня бессаромна дапякае сваю работніцу, прымушае выконваць непасільную працу. Але ўсё мяняецца, калі насельнікі дома даведваюцца, што Праскоўя Пітунова стала дэпутатам Массавета ад прафсаюза пакаёвак...

«Дом на Трубнай» — адна з тых жамчужын кіно, у якіх жанчыны кіруюць светам.

Варта дадаць, што 8 лістапада ў сталічнай прасторы «ок16» адбудзецца адмысловы клубны канцэрт Аляксея Айгі і Ансамбля 4'33'' для гасцей і гледачоў фестывалю «Лістапад».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

---

■ Праз прызму часу

# На крутым павароце гісторыі

**Улічваючы асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў розныя гістарычныя перыяды, параўнаем тлумачэнні слоў «рэвалюцыя» і «рэвалюцыянер» у шэрагу вядомых слоўнікаў. У слоўніку У. І. Даля (1882) «рэвалюцыя» падаецца як «пераварот, раптоўная перамена стану, парадку адносін», «смута, трывога». Слова «рэвалюцыянер» тлумачыцца як «бунтаўшчык, падбухторшчык, крамольнік, мяцежнік».**

**«Рэвалюцыя» ў «Савецкім энцыклапедычным слоўніку» (1987) падаецца як «сродак пераходу ад гістарычна зжыўшай сябе грамадска-эканамічнай фармацыі да больш прагрэсіўнай». Тэрмін «рэвалюцыянер» па невядомай прычыне адсутнічае. Але ён змешчаны ў «Слоўніку рускай мовы» (2007) С. І. Ожагава і тлумачыцца як «дзеяч, які змагаецца рэвалюцыйнымі метадамі». А што да апошніх адносіцца — незразумела. Гэта паняцце, мабыць, вынікае са слова «рэвалюцыя»: «карэнны і рэзкі пераварот у грамадска-палітычных адносінах гвалтоўным шляхам, які прыводзіць да змены грамадскага ладу». У шэрагу савецкіх слоўнікаў «рэвалюцыя» тлумачыцца як тэрмін французскага паходжання. Такім чынам, радзіма слова «рэвалюцыя» — Францыя, а не Расія.**

18. В случае запрещения эмиссии облигаций, признания регистрирующим органом настоящего выпуска облигаций недействительным, эмитент возвращает владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных облигаций, а также накопленный по этим облигациям доход в месячный срок с даты признания выпуска недействительным, и письменно уведомляет регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам облигаций в полном объеме.

19. Ознакомиться с Проспектом эмиссии (изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно визуально по адресу, указанному в пункте 2 настоящего документа, ежедневно, кроме нерабочих дней, с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Управляющий ООО «КОНТРАКТОР» — С. Н. Рулькевич

Главный бухгалтер ООО «КОНТРАКТОР» — Е. В. Янушко

## Спорт-тайм

# Аддаліліся ад плэй-оф

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра выніке чарговага тура чэмпіянату краіны па футболе, выступленне мінскага «Дынама» ў КХЛ і БГК імя Мяшкова ў Лізе чэмпіёнаў.**

**1. Завяршыліся матчы 28-га тура чэмпіянату краіны па футболе.** Барысаўскі БАТЭ перамог у гасцях жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ» — 4:2. Лідар першынства салігорскі «Шахцёр» з буйным лікам перайграў «Нафтан» — 5:1, футбалісты мінскага «Дынама» былі мацнейшыя за «Слуцк» — 2:0, «Нёман» саступіў брэсцкаму «Дынама» — 0:2, «Дняпро» перайграў «Славію» — 5:3. Футбалісты «Віцебска» саступілі «Іслачы» — 0:2, а «Крумкачы» з мінімальным лікам прайгралі «Гомелю» — 0:1. Матч «Гарадзеі» і «Мінска» завяршыўся з роўным лікам 1:1.

Такім чынам, на першым радку турнірнай табліцы па-ранейшаму застаецца салігорскі «Шахцёр» — (65 ачкоў), за ім ідзе мінскае «Дынама» — 62, БАТЭ замыкае тройку — 61 бал. Матчы перадапошняга, 29-га, тура адбудуцца 18 лістапада.

**2. Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» пасля пяці праведзеных сустрэч займаюць 7-е месца сярод 13 удзельнікаў чэмпіянату Адзінай лігі ВТБ.** У трэцім запар дамашнім паядынку мінчане прайгралі казанскаму «Уніксу» — 65:91. Самым выніковым у складзе нашай каманды стаў Крыс Чэраповіч, у актыве якога 15 ачкоў.

Нагадаем, да гэтага падапечныя Аляксандра Круцікава перамаглі гасцей з казахстанскай «Астаны» (75:66) і пермскай «Пармы» (66:65), а ў двух стартавых выязных паядынках саступілі двум фаварытам — падмаскоўным «Хімкам» (55:83) і маскоўскаму ЦСКА (54:90).



«Цмокі-Мінск» свой наступны матч Адзінай лігі ВТБ правядуць 11 лістапада ў гасцях у «Ніжняга Ноўгарада». А да гэтага, 8 лістапада, правядуць чарговы паядынак групавога этапу Кубка ФІБА-Еўропа ў гасцях у бельгійскага клуба «Шарлеруа».

**3. Хакеісты мінскага «Дынама» на дамашняй пляцоўцы саступілі «Северсталі» з лікам 1:2 і аддаліліся ад зоны плэй-оф.**



— Гэта была вельмі важная гульня для абедзвюх камандаў. Вядома, я расчараваны вынікам. Мы гулялі дастаткова нядрэнна, але гэтага «дастаткова» не хапіла. Гэта быў матч, у якім усё вырашаў адзін гол. І калі ты ўжо прапусціў шайбу, то патрабавалася куды лепш і больш актыўна дзейнічаць у нападзенні, — адзначыў **галоўны трэнер «зуброў» Гордзі ДУАЕР.** — Падчас перапынку ў КХЛ разам з хлопцамі, якія застануцца тут, удзелім увагу гульні ў абароне. Цяпер гэта кампанент, які патрабуе паляпшэння. Для хлопцаў, якіх выклікалі ў зборную Беларусі, будзе шанц атрымаць добры вопыт, асабліва гэта датычыцца маладых гульцоў. Таксама, думаю, атрымае свой шанц выкліканы ў зборную Швецыі Юнас Энрот — ён выдатна зарэкамендаваў сябе ў матчах за «Дынама».

Наступную гульню ў дзясятым сезоне КХЛ мінскае «Дынама» правядзе пасля міжнароднай паўзы, якая надыходзіць у сувязі з выступленнем нацыянальных зборных. Мінскае «Дынама» 13 лістапада прыме на сваёй пляцоўцы «Ак Барса».

**4. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў шостым туры Лігі чэмпіёнаў прайграў нямецкаму «Кілю» — 24:25.** Адзначым, што гэты паядынак быў вызначаны Еўрапейскай федэрацыяй гандбола матчам тыдня.

Наступную гульню ў Лізе чэмпіёнаў БГК зноў правядзе дома. На пляцоўцы Палаца спорту «Вікторыя» 11 лістапада прыме яшчэ аднаго прадстаўніка Бундэслігі — «Фленсбург».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## Здарэнне

### Выйшаў з-за руля і скокнуў з моста

**У Гродне кіроўца спыніў аўтобус на мосце і на вачах пасажыраў кінуўся ўніз.**

mchs.gov.by



Паведамленне пра тое, што ў Нёмане апынуўся чалавек, паступіла на ратавальную станцыю «Цэнтральная» ўдзень. На месца здарэння выйшаў ратавальны катар, і мужчыну паднялі з вады ў раёне Каложскай царквы. Ён быў жывы, яго перадалі супрацоўнікам хуткай дапамогі.

Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гродзенскага аблвыканкама, кіроўца, мужчына 1960 года нараджэння, у нейкі момант спыніў аўтобус на мосце, адчыніў пярэдняя і задняя дзверы, выйшаў з салона, пералез церaз агароджу і на вачах пасажыраў кінуўся ўніз з 20-метровай вышыні.

Аўтобус 21-га маршрута выехаў на мост у цэнтры Гродна. Справа была паблізу цэнтральнага пляжа, там знаходзіцца ратавальная станцыя, так што мужчыну хутка дасталі з вады. А пакінуты без кіроўцы аўтобус сфарміраваў затор. Але не асабліва сур'ёзны з-за не самага інтэнсіўнага трафіку. Абставіны здарэння ўдакладняюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Даты | Падзеі | Людзі

### 8 ЛІСТАПАДА

**1858** год — нарадзіўся (г. Вільня) Тадэвуш Урублеўскі, адвакат, публіцыст, грамадскі дзеяч. З 1886 года працаваў адвакатам у Пецярбургу, Вільні, юрысконсультам ва ўпраўленні Палескай чыгункі. Падчас рэвалюцыі 1905—1907 гадоў выступаў абаронцам на судовых працэсах над удзельнікамі рэвалюцыйных падзей, у тым ліку матросамі з браняносца «Пацёмкін», крэйсера «Ачакаў» на чале з лейтэнантам П. П. Шмітам, пазней — прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі: Я. Коласам, Цёткай і іншымі. Памёр у 1925 годзе.

**1897** год — нарадзіўся Андрэй Рыгоравіч Мядзведзеў, беларускі вучоны ў галіне глебазнаўства, член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Склаў зводную глебавую карту Беларусі, кіраваў буйнамаштабнымі глебавымі даследаваннямі зямель рэспублікі. Аўтар каля 150 навуковых прац. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1985 годзе.

**1902** год (г. Мінск) — нарадзіўся Ісак Самэнавіч Брук, савецкі вучоны ў галіне энергетыкі і вылічальнай тэхнікі, член-карэспандэнт АН СССР (1939), доктар тэхнічных навук. Стваральнік навукова-інжынернай школы па распрацоўцы вылічальных машын. Аўтар навуковых прац па электраэнергетычных сістэмах, электрычных і электронна-вылічальных машынах. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны першыя ў СССР лічбавыя ЭВМ з жорсткім праграмным кіраваннем (1948) і створаны малыя лічбавыя ЭВМ М-1, -2, -3. У 1959—1960 гадах Мінскі завод ЭВМ серыйна выпускаў М-3 і яе мадыфікацыю М-3М. Памёр у 1974 годзе.

**1917** год — II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў прыняў Дэкрэт аб міры і Дэкрэт аб зямлі — першыя дэкрэты Савецкай улады.



ИЗВѢСТІЯ

Декретъ о мирѣ

ИЗВѢСТІЯ

ДЕКРЕТЪ О ЗЕМЛѢ

**1932** год — 32-м прэзідэнтам ЗША абраны Франклін Дэлана Рузвельт, з імем якога звязаны сацыяльна-эканамічныя рэформы па пераадоленні эканамічнага крызісу («новы курс») і важныя крокі па стварэнні антыгітлераўскай кааліцыі. Стаў адзіным у гісторыі краіны прэзідэнтам, які чатыры разы абіраўся на пасаду кіраўніка амерыканскай дзяржавы.

### Было сказана

**Васіль ЖУКОВІЧ, пісьменнік, публіцыст:**

*«У акіяне слова —*
*а ні мяжы, ні донца.*
*Ёсць там адна аснова:*
*праца*
*і праца бясконца».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.23 | 17.22 | 8.59 |
| Віцебск — | 8.18 | 17.07 | 8.49 |
| Магілёў — | 8.14 | 17.12 | 8.58 |
| Гомель — | 8.05 | 17.14 | 9.09 |
| Гродна — | 8.38 | 17.38 | 9.00 |
| Брэст — | 8.33 | 17.44 | 9.11 |

### Месяц

*Апошняя квадра 10 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

*Пр. Апанаса, Дзмітрыя.*
*К. Клаўдзіі, Адрыяна, Віктара, Готфрыда, Севярына.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Мама, калі ты не дасі мне грошай на марожанае, то, як толькі мы ўвойдзем у аўтобус, я стану зваць цябе бабуляй!

**Ёсць два віды дзяўчат:**
**1. — А мне хлопец айфон купіў. Вельмі люблю свой айфон!**
**2. — А мне хлопец шакаладку купіў. Вельмі люблю свайго хлопца!**

— Роза Майсееўна, колькі вам гадоў?
— Ды кожны год па-рознаму!

**Вельмі тоўсты паляўнічы сабака прыносіць паляўнічаму прабачэнні.**

Сёння сам прыбраўся ў кватэры!
Хай цяпер жонка паспрабуе знайсці свае калготкі!




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4262.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 7 лістапада 2017 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

8 лістапада 2017 г. №42 (426)




стар. 3

Змены ў пенсійным заканадаўстве



стар. 6

Што прагназуе гродзенскі прадпрымальнік?



стар. 8

Пра электрыкаў, якіх не выклікалі

ТЭМА ТЫДНЯ

# БІЗНЕС ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

## Як улада дапаможа развіццю прадпрымальніцтва?




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**З 1 студзеня пачне працаваць пакет дакументаў па разняволенні бізнесу. Кіраўнік дзяржавы падпісаў ужо амаль усе яго складнікі. Прычым Аляксандр Лукашэнка вельмі ўважліва падышоў да гэтай тэмы. Першая вялікая нарада — з удзелам высокіх службовых асоб, бізнесменаў, кіраўнікоў зацікаўленых грамадскіх арганізацый — прайшла яшчэ ў лютым. А ў пачатку жніўня Прэзідэнт заслухаў даклад, прысвечаны выкананню яго даручэнняў. На працягу наступных месяцаў кіраўнік краіны правёў шэраг рабочых сустрэч, падчас якіх дэтальна абмеркаваў нюансы кожнага з дакументаў па разняволенні дзелавой ініцыятывы.**

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# СПРАВАЙ ПАВІННЫ ЗАЙМАЦЦА НЕ ДЫЛЕТАНТЫ, А СПЕЦЫЯЛІСТЫ

## Дэпутаты Бабруйскага і Чэрыкаўскага раёнаў пра тое, ці павінны сельвыканкамы адказваць за ўсё і якіх законаў нам не хапае

**Сёння ўмовы жыцця ў сельскай мясцовасці цалкам залежаць ад эфектыўнай работы сельвыканкамаў. На іх плячах не толькі адміністрацыйныя працэдуры, пытанні добраўпарадкавання, абслугоўвання інфраструктуры населеных пунктаў. Але яшчэ і назіральныя камісіі, якія павінны працаваць нават з тымі грамадзянамі (калі яны здзейснілі правапарушэнне), якія не прапісаны ў сельсавеце, саветы грамадскіх пунктаў аховы правапарадку (СГПАП), якія займаюцца перавыхаваннем часам відавочна неадэкватных грамадзян, маніторынг і ўлік вулічнага асвятлення. Гэта, канешне, таксама важна. Але, як сведчаць дэпутаты, ёсць моманты, якія перашкаджаюць наладзіць эфектыўную работу. Па-сутнасці, дылетантам прыходзіцца вырашаць часам зусім далёкія ад іх пытанні. У выніку якасць кульгае, нерацыянальна выдаткоўваюцца бюджэтныя грошы. І з гэтым трэба нешта рабіць, сігналізуюць народныя абраннікі.**

### ЛЯМПАЧКІ ЎКЛЮЧАЕМ, ПАКАЗАННІ ЗНІМАЕМ

Для пачатку звернемся да Пастановы Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь ад 30.01.2008 №2 «Аб зацвярджэнні Тыпавога палажэння аб парадку правядзення арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па міжрамонтным абслугоўванні сетак вонкавага асвятлення сельскіх населеных пунктаў», якой павінны кіравацца ў сваёй рабоце сельвыканкамы.

стар. 7




Старшыня Бабруйскага райсавета дэпутатаў Аляксандр ЕМЯЛЬЯНАЎ.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# УЗАЕМНАЕ ПРЫЗНАННЕ ВІЗ

*Беларускія і расійскія дэпутаты абмяркавалі стварэнне адзінай міграцыйнай прасторы*

**У Гродне адбылося 74-е пасяджэнне Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі (ПС) па пытаннях знешняй палітыкі. Яго работу ўзначалiў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Камісіі ПС па пытаннях знешняй палітыкі Сяргей Рахманаў.**




Падчас пасяджэння дэпутаты абмяркоўвалі ўзаемнае прызнанне віз для грамадзян іншых краін. Гэта дазволіць паскорыць праходжанне памежнага кантролю, спрасціць дзелавыя і турыстычныя паездкі, але на бяспецы не адаб'ецца. У Беларусі цяпер дзейнічае бязвізавы рэжым для грамадзян амаль 80 краін, але, каб патрапіць у Расію, большасць з іх вымушана афармляць поўны пакет дакументаў.

Сяргей Рахманаў расказаў, што неабходна неадкладна скаардынаваць дзеянні дзвюх краін: «Мы дэталёва вывучылі пытанне аб узаемным прызнанні віз. Гэта частка работы па ўмацаванні Саюзнай дзяржавы. Займаемся пагадненнем, якое падрыхтуем да канца года. Разглядаем пытанні, якія прапанавалі беларускі бок і нашы расійскія калегі. Пагадненне будзе паўнакроўным дакументам, які ўлічыць усе аспекты. Пасля яго ратыфікацыі самі сабой здымуцца многія вострыя праблемы».

Таксама сярод разгледжаных пытанняў пасяджэння — стан і перспектывы гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння Гродзенскай вобласці з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, праект Плана міжнароднай дзейнасці ПС на 2018 год, вынікі ўдзелу дэлегацыі ў рабоце 137-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза і інш. Па выніках работы падрыхтаваны адпаведныя рэкамендацыі, якія будуць прадстаўлены кіраўніцтву Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

# БЛІЖЭЙ ДА ПАРЛАМЕНТА

*Школьнікі са Стаўбцоўскага раёна наведалі Савет Рэспублікі*

**У верхняй палаце беларускага парламента адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірыны Старавойтавай і намесніка старшыні гэтай камісіі, намесніка старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Віктара Сірэнкі з навучэнцамі Дзераўнянскай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна.**

Старшакласнікі азнаёміліся з гісторыяй будынка, у якім размяшчаецца Савет Рэспублікі, наведалі музей сувеніраў, перададзеных беларускім парламентарыям дэлегацыямі з замежных дзяржаў, апрабавалі сістэму галасавання ў зале пасяджэнняў.

Ірына Старавойтава расказала школьнікам пра гісторыю станаўлення беларускага парламентарызму, парадак фарміравання, кампетэнцыі і структуры Савета Рэспублікі, удасканаленне заканадаўчага рэгулявання сацыяльнай сферы, больш падрабязна спынілася на дзейнасці Пастаяннай камісіі, якую яна ўзначальвае. Віктар Сірэнка закрануў тэму ўзаемадзеяння мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і Саветаў дэпутатаў.

Парламентарыі пажадалі маладым людзям поспехаў у засваенні новых ведаў і дасягнення пастаўленых мэт.

# СУСВЕТНЫ ВОПЫТ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

*Сенатар узяў удзел у Кастрычніцкім форуме*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў у рамках Кастрычніцкага эканамічнага форуму, які адбыўся 2—3 лістапада ў Мінску, прыняў удзел у канферэнцыі «Асновы будучыні».**

На пасяджэнні разгледжаны бягучыя тэндэнцыі сусветнай эканомікі і іх уплыў на сітуацыю ў Беларусі, актуальныя праблемы развіцця расійскай эканомікі, а таксама кірункі некаторых інстытуцыйных рэформаў для Беларусі з улікам сусветнага вопыту.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ІНТЭГРАЦЫЙНАЯ ПЛЯЦОЎКА

# СТАЛІЦА ПЕРАДАЕ ПАЎНАМОЦТВЫ

**Пяты Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі пройдзе ў Магілёўскай вобласці**

**У Магілёве пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА адбылася нарада, прысвечаная падрыхтоўцы і правядзенню V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Плануецца, што Форум на тэму «Прыярытэтныя напрамкі развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва як ключавога фактару інтэграцыі і саюзнага будаўніцтва» адбудзецца ў верасні 2018 года ў Магілёўскай вобласці.**



Фота БЕЛТА.

Упершыню Форум рэгіёнаў будзе праводзіцца не ў сталіцы адной з дзяржаў, а непасрэдна ў рэгіёне. Тэматычныя секцыі гэтага маштабнага мерапрыемства пройдуць на пляцоўках вядучых прадпрыемстваў Магілёва і Шклова, а таксама Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. У рамках V Форуму рэгіёнаў адбудуцца міждзяржаўныя мерапрыемствы кіраўнікоў дзяржаў Беларусі і Расіі, пятае пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, пасяджэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва.

Запланавана і правядзенне шматлікіх спадарожных мерапрыемстваў: тыдня інтэграцыі і супрацоўніцтва, бізнес-форуму, уключаючы Форум дзелавых колаў Магілёўскай і Бранскай абласцей, а таксама падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве і камерцыйных кантрактах. Чакаецца, што падчас работы Форуму пройдзе Злёт моладзі і студэнтаў, спартакіяда Саюзнай дзяржавы, адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя, адкрыццё музея В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве.

Сярод пытанняў, якія плануецца абмеркаваць на пятым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, — перспектывы эканамічнага супрацоўніцтва рэгіёнаў абедзвюх краін на аснове развіцця IT-тэхналогій, фарміраванне ВУП праз сумесныя праекты па развіцці лічбавай эканомікі, гарманізацыя заканадаўства ў частцы прымянення інфармацыйных паслуг і інш.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ** адзначыў: «Адным з асноўных чаканых вынікаў чарговага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі стане правядзенне парламенцкага маніторынгу выканання базавых дакументаў Саюзнай дзяржавы. Плануем правесці сумесныя калегіі галіновых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі і Расійскай Федэрацыі, на якіх прааналізуем вынікі сумеснай работы і вызначым стратэгічныя перспектывы далейшага супрацоўніцтва. Мы павінны прапанаваць канцэпцыю далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы». На думку парламентарыя, сёння неабходна прааналізаваць прычыны невыканання тых ці іншых абавязацельстваў у рамках Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ад 8 снежня 1999 года і выпрацаваць адзіныя падыходы па далейшай уніфікацыі і гарманізацыі нацыянальных заканадаўстваў Беларусі і Расіі.

Плануецца, што актыўны ўдзел у рабоце V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі прымуць беларускія і расійскія вучоныя. Развіццю навукі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі будзе прысвечана работа адной з пяці тэматычных секцый. Пры гэтым секцыя Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні павінна прайсці на базе Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ЗАЛАТАЯ СЯРЭДЗІНА,

## або Новы імпульс спажыўкааперацыі

**Як арганізаваць эфектыўны гандаль у сельскай мясцовасці, каб не цярпець страту і задаволіць попыт насельніцтва? Дзе залатая сярэдзіна паміж сацыяльнай скіраванасцю і камерцыйнай зацікаўленасцю? Якую ролю іграюць у гэтым мясцовыя органы ўлады? Шукаць адказы на гэтыя і іншыя пытанні спажывецкай кааперацыі будуць на чарговым пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якое адбудзецца на базе прадпрыемстваў Віцебскай вобласці ў канцы лістапада.**



Падчас наведвання прамыслова-перапрацоўчага комплексу Пастаўскага райспажыўтаварыства.

Гэтым разам пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пройдзе сумесна з пасяджэннем Праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў на прадпрыемствах Пастаўскага райспажыўтаварыства. Яго тэма — «Пра работу мясцовых органаў улады па павышэнні канкурэнтаздольнасці арганізацый спажыўкааперацыі і ўдасканаленні іх дзейнасці ў мэтах забеспячэння эканамічнай заможнасці рэгіёнаў і задавальнення патрэб насельніцтва на прыкладзе Віцебскай вобласці».

Цяпер спажывецкая кааперацыя, мабыць, самая разгалінаваная арганізацыя ў нашай краіне па аказанні паслуг сельскаму насельніцтву. Гандаль і грамадскае харчаванне, закупка і нарыхтоўка сельскагаспадарчай прадукцыі, вытворчасць тавараў першай неабходнасці... Сёння прадпрыемствамі Белкаапсаюза аказваецца больш за 60 відаў паслуг, уключаючы паслугі рынкаў, апрацоўкі прысядзібных участкаў, транспартныя паслугі, паслугі пракату — і гэта яшчэ не поўны пералік кірункаў дзейнасці спажыўкааперацыі. Па звестках статыстыкі, у гэтай структуры працуе каля 70 тысяч чалавек, якія абслугоўваюць 3,4 мільёна беларусаў, ці больш за 35% насельніцтва краіны, у тым ліку ўсё сельскае насельніцтва.

Таму невыпадкова праблемы канкурэнтаздольнасці і ўдасканалення работы гэтай галіны стануць галоўнай тэмай абмеркавання на сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання з Праўленнем Белкаапсаюза, якое запланавана на канец лістапада. Ступень гатоўнасці да гэтага мерапрыемства прадпрыемстваў Пастаўскага райспажыўтаварыства была ў цэнтры ўвагі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова.

— Сёння галоўнай мэтай прадпрыемстваў спажывецкай кааперацыі і ўсіх яе структурных падраздзяленняў павінен стаць актыўны ўдзел у фарміраванні даходнай часткі бюджэту свайго рэгіёна, — падкрэсліў парламентарый падчас наведвання прамыслова-перапрацоўчага комплексу Пастаўскага райспажыўтаварыства. — Белкаапсаюзу трэба выйсці на якасна новы ўзровень. Цяпер трэба думаць не толькі пра дакладную арганізацыю гандлю ў сельскіх населеных пунктах, а ў першую чаргу пра стварэнне невялікіх прадпрыемстваў па перапрацоўцы сыравіны, пра пошук новых формаў арганізацыі закупак сельгаспрадукцыі ў насельніцтва і збыт яе за межамі краіны.

У ходзе рабочага візіту Аляксандра Папкова адбылося абмеркаванне выканання даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па паляпшэнні фінансавага стану прадпрыемстваў Белкаапсаюза, павышэнні іх эфектыўнасці і даступнасці паслуг для сельскага насельніцтва. Выступаючы на нарадзе з удзелам прадстаўнікоў Віцебскага аблвыканкама, Белкаапсаюза і кіраўніцтва Пастаўскага райвыканкама, сенатар звярнуў увагу на шэраг недахопаў у арганізацыі работы хлебапякарнага цэха і агароднінасховішчаў Пастаўскага райспажыўтаварыства.

Плануецца, што на сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання з Праўленнем Белкаапсаюза будуць абмяркоўвацца таксама пытанні мадэрнізацыі вытворчасцяў і павышэння эфектыўнасці работы прадпрыемстваў спажывецкай кааперацыі, праблемы нарыхтоўчай дзейнасці і развіцця сеткі аб'ектаў грамадскага харчавання прыдарожнага сэрвісу.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

РАЗАМ

# УЛАДА ПАВІННА БЫЦЬ ДАСТУПНАЙ

**Як на месцах выконваецца Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні»? Адказ на гэта пытанне шукалі ў Жлобінскім і Буда-Кашалёўскім раёнах дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Гомельскага абласнога Савета.**



**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Леанід ЦУПРЫК** падкрэслівае, што дэпутацкі корпус імкнецца ўсебакова адпрацоўваць кожнае палажэнне закона:

— Трэба адзначыць, што частка закона, якая датычыцца грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, патрабуе далейшага развіцця. Мы бачым, што мясцовыя ўлады накіраваны на тое, каб павышаць эфектыўнасць узаемадзеяння органаў кіравання і самакіравання. У першую чаргу трэба ўбачыць і падтрымаць неабыякавых, актыўных людзей. Тых, хто не толькі выказвае крытыку, але і мае канструктыўныя прапановы. Шмат пытанняў можа вырашацца толькі пры аб'яднанні намаганняў насельніцтва з органамі мясцовай улады. Мы шукаем ідэі: тыя прапановы і напрацоўкі, якія ёсць у мясцовых Саветаў.

У Жлобіне прадпрымальнік Аляксандр Рулянкоў падзяліўся вопытам узаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады. Дарэчы, ён зусім нядаўна завяршыў маштабную рэканструкцыю будынка, дзе цяпер размешчаны сучасны прыватны медыцынскі цэнтр.

На тэрыторыі мікрараёна Лебядзёўка-Поўдзень старшыня Савета адміністрацыйнага тэрытарыяльнага ўтварэння №3 г. Жлобіна Ігар Чарняўскі і дырэктар камунальнай арганізацыі «Жылкамсэрвіс-два», дэпутат райсавета Ігар Аляксеенка расказалі, як вырашаюць пытанні, актуальныя для насельніцтва. Дарэчы, жыхары мікрараёна прымаюць актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый і дзіцячых пляцовак. Скінуліся, набылі і ўсталявалі камеры відэаназірання. Такія выдаткі ацанілі не толькі праваахоўнікі, якія некалькі разоў ужо скарысталіся запісамі. Жыхары заўважылі, што пад пільным нястомным відэавокам менш стала здарацца нават дробных парушэнняў.

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, дэпутат абласнога і раённага Саветаў Галіна Мельнікава расказала аб ролі раённай газеты «Новы дзень» у стварэнні эфектыўнай зваротнай сувязі паміж органамі мясцовай улады і насельніцтвам.

Мясцовыя ініцыятывы — тэма, якую дэпутаты вывучалі на базе Буда-Кашалёўскага раёна. Менавіта тут яшчэ ў 2010 годзе адным з першых на Гомельшчыне пачалі рэалізацыю ў межах праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» ініцыятывы «Адродзім ручнік разам». Цяпер яна збірае дзятву ў Гусевіцкім сельскім доме культуры. Хутка тут пачне працаваць творчая майстэрня, дзе можна будзе адрэстаўраваць старыя і зрабіць новыя ткацкія станкі, а таксама сувеніры з дрэва.

Пра ролю органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў рэалізацыі такіх ініцыятыў для стварэння камфортных умоў пражывання на сельскіх тэрыторыях праінфармавала старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў Алена Алексіна. Вынікі працоўнай паездкі дэпутаты абмяркоўвалі падчас гутаркі на пленарным пасяджэнні камісіі, якая адбылася ў Буда-Кашалёўскім райвыканкаме.

— У краіне разгортваецца работа па падтрымцы ініцыятыўных дзеялавых людзей, — адзначыў Леанід Цупрык. — У сувязі з няўмольным тэхнічным прагрэсам развіваюцца камунікацыі паміж людзьмі. Сёння дзякуючы электронным лічбавым тэхналогіям пашыраюцца нашы магчымасці. Паслугі, якія прадастаўляюцца органамі ўлады, павінны быць яшчэ больш даступныя для кожнага чалавека. Мы ідзём да таго, што чалавеку дастаткова проста абазначыць для мясцовых органаў улады патрэбу ў рашэнні нейкага пытання — і ён тэрмінова атрымае вынік. Першым крокам у гэтым кірунку было стварэнне сістэмы «аднаго акна». Цяпер выходзім на новы ўзровень, звязаны з работай электроннага ўрада. З пераходам на электронны дакументаабарот, вядома, з'явіцца магчымасць вырашаць пытанні праз лічбавыя тэхналогіі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*



НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# КАРЭКТЫВЫ Ў ПЕНСІЙНЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ

## Якія змены ў заканадаўстве ў гэтай сферы плануецца ўнесці?

**З 1 лістапада для беларусаў выраслі мінімальныя працоўныя і ўзроставыя пенсіі. Для асобных катэгорый грамадзян павялічыліся надбаўкі, даплаты і дапамогі. Але работа ў сферы пенсійнага забеспячэння на гэтым не канчаецца. Цяпер у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі рыхтуюць да разгляду ў першым чытанні праект закона «Аб пенсійным забеспячэнні».**

Перш за ўсё, неабходна прывесці палажэнні закона ў адпаведнасць з нормамі Указа Прэзідэнта №233 «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый грамадзян». Ён уступіў у сілу 1 жніўня гэтага года. Мэта новаўвядзенняў — змякчыць умовы фарміравання права на працоўную пенсію па ўзросце асобным катэгорыям грамадзян. Такім чынам адбываецца зніжэнне да 10 гадоў мінімальнага стажу працы з выплатай абавязковых страхавых узносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) Беларусі.

Па словах **Юліі МУРЫНАЙ, члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях,** якая зараз працуе над гэтым законапраектам, прапанаваныя змяненні закрануць асоб, якія працяглы перыяд займаюцца грамадска значнай дзейнасцю. Да іх адносяцца догляд за дзецьмі ва ўзросце да трох гадоў, інвалідамі I групы і асобамі, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, а таксама за тымі, хто мае патрэбу ў пастаянным доглядзе.

«Для гэтай катэгорыі грамадзян пенсія па ўзросце прызначаецца пры наяўнасці страхавога стажу не менш за 10 гадоў і пры агульным стажы работы ў жанчын не менш за 35 гадоў, у мужчын — не менш за 40 гадоў. Акрамя таго, павялічана працягласць уключанага ў стаж перыяду догляду інвалідаў I групы да дасягнення тымі, хто здзяйсняе догляд, узросту 60/65 гадоў (для жанчын/мужчын), якія па дасягненні агульнапенсійнага ўзросту не сфарміравалі права на працоўную пенсію», — растлумачыла дэпутат.



Таксама прынята рашэнне ў дачыненні да грамадзян, што праходзілі ваенную службу (службу ў ваенізаваных арганізацыях), якім для права на пенсію па ўзросце неабходна наяўнасць агульнага стажу працы не менш за 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын. Пры гэтым згаданы стаж абавязкова павінен уключаць не менш за 10 каляндарных гадоў ваеннай службы (службы ў ваенізаваных арганізацыях).

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «МС» аб тым, якія тэндэнцыі мае сучаснае пенсійнае забеспячэнне, Юлія Мурына выказала меркаванне, што да выплат варта прыцягваць і замежныя фінансы: «Ва ўмовах эканамічнай і дэмаграфічнай сітуацыі, якая складваецца ў апошнія гады, у прыярытэце застаецца работа па ўтрыманні пенсійных выдаткаў у межах паступленняў у бюджэт фонду і забеспячэнні своечасовай выплаты пенсій. На мой погляд, далейшая работа па ўдасканаленні пенсійнага заканадаўства будзе кропкавай. Мяркую, што асноўная ўвага будзе ўдзяляцца развіццю і ўдасканаленню міжнароднай дагаворна-прававой базы па пытаннях пенсійнага забеспячэння ў мэтах прыцягнення фінансавых рэсурсаў замежных дзяржаў, на тэрыторыі якіх працавалі грамадзяне, да суфінансавання выплаты пенсій».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviada.by*

Сваёй гісторыяй падзялілася **48-гадовая мінчанка *Людміла Пятрова***. Яе маці страціла зрок з-за ўскладненняў ад цукровага дыябету і атрымала інваліднасць першай групы. Цяпер яе даглядае дачка, якая да гэтага працавала медсястрой. Непасрэдна на Людмілу новаўвядзенне не паўплывае, але яна лічыць, што меры, прынятыя ў сувязі з доглядам за інвалідамі, справядлівыя і правільныя: «Так склалася, што я цяпер не працую па спецыяльнасці, а даглядаю маці. І, хачу вам сказаць, што гэта не меншая колькасць работы, чым мне давodзілася выконваць калісьці ў паліклініцы. Догляд — гэта таксама праца, і ўключэнне яе ў працоўны стаж цалкам справядлівае. Калі маці перастала бачыць, мне было 42. А калі б гэта здарылася раней, калі ў мяне працоўнага стажу было менш? Я ўсё адно б яе не пакінула на плечы сацыяльных работнікаў. Бо хто так дагледзіць маю маму, як я сама, родны ёй чалавек?..»

# БІЗНЕС ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

## Карысць для дзяржавы і грамадства

Кіраўнік дзяржавы ў першую чаргу патрабаваў ліквідаваць усе непатрэбныя адміністрацыйныя бар'еры і працэдуры, якія перашкаджаюць рабоце бізнесу. У той жа час дакументы па разняволенні бізнес-ініцыятывы павінны ў поўнай меры адпавядаць інтарэсам дзяржавы. «Скажу проста па-чалавечы, як чалавек дзяржаўны: ад любых нашых з вамі сумесных дзеянняў — маіх, як прадстаўніка ўлады, і вашых, як прадстаўнікоў бізнесу, — павінен быць нейкі эфект для дзяржавы і для бізнесу, — заявіў на нарадзе ў пачатку жніўня Аляксандр Лукашэнка. — Гульня ў адны вароты непрымальная».

Ключавым у названым пакеце дакументаў з'яўляецца Дэкрэт Прэзідэнта «Аб развіцці прадпрымальніцтва і выключэнні лішніх патрабаванняў, што прад'яўляюцца бізнесу». Ён прадугледжвае кардынальнае змяненне механізму ўзаемадзеяння дзяржавы і бізнесу.

> З дзеючых сёння 586 пунктаў правілаў пажарнай бяспекі, сямі дадаткаў і 13 табліц захавана толькі 58 пунктаў!

Дакумент мінімізуе ўмяшанне дзяржавы ў работу суб'ектаў гаспадарання, умацоўвае механізмы самарэгулявання бізнесу і яго адказнасць за сваю дзейнасць перад грамадствам. Вызначаны шэраг падыходаў, на аснове якіх будзе працаваць дакумент.

Па-першае, гэта паведамляльны парадак здзяйснення асобных, найбольш распаўсюджаных відаў эканамічнай дзейнасці. Іх пералік вызначае Дэкрэт. У гэты шэраг уключаны бытавыя, турыстычныя, сацыяльныя паслугі, дзейнасць у сферы гандлю і грамадскага харчавання, перавозкі пасажыраў і багажу, вытворчасць прадукцыі, будматэрыялаў... Для таго каб займацца згаданымі відамі дзейнасці, дастаткова будзе падаць адно паведамленне ў выканкам праз службу «адно акно» або з дапамогай адзінага партала электронных паслуг. На наступны дзень можна будзе смела здзяйсняць заяўлены від эканамічнай дзейнасці.

Па-другое, гэта замацаванне адзіных патрабаванняў пажарнай бяспекі, санітарна-эпідэміялагічных умоў, патрабаванняў у галіне аховы навакольнага асяроддзя і патрабаванняў у сферы ветэрынарыі да ўтрымання і эксплуатацыі капітальных будынкаў. Гэтыя патрабаванні максімальна сістэматызаваны і скарочаны. З дзеючых сёння 586 пунктаў правілаў пажарнай бяспекі, сямі дадаткаў і 13 табліц захавана толькі 58 пунктаў!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Па-трэцяе, павінны быць максімальна спрошчаны адміністрацыйныя бар'еры, звязаныя з наяўнасцю складаных і доўгатэрміновых працэдур атрымання даведак, узгадненняў і іншых відаў дазвольнай дакументацыі. Напрыклад, у сферы гандлю і грамадскага харчавання прапануецца адмовіцца ад узгаднення выканкамамі рэжыму працы гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў грамадскага харчавання. Выключэнне — іх праца ў начны час — з 23 да 7 гадзін раніцы.

> **Дэкрэт таксама прадугледжвае ўстанаўленне мараторыя на павышэнне падатковых ставак і ўвядзенне новых падаткаў, збораў (пошлін). Мяркуецца, гэта будзе садзейнічаць стабілізацыі фінансавай дзейнасці прадпрыемстваў.**

## Менш праверак, менш ліцэнзій

Указ Прэзідэнта «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці» скіраваны на сістэмную аптымізацыю кантрольнай функцыі дзяржавы. Ён прадугледжвае ў першую чаргу ўвядзенне мараторыю на правядзенне ўсіх відаў праверак да 1 студзеня 2018 года. У той жа час гэта не адносіцца да праверак, што праводзяцца па даручэнні кіраўніка дзяржавы, прэм'ер-міністра, старшыні Камітэта дзяржкантролю, Генеральнага пракурора, міністра фінансаў і міністра па падатках і зборах.

«Мы сапраўды павінны прыбраць усё лішняе, што перашкаджае рабоце людзей, прадпрыемстваў, але кантроль павінен заставацца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка падчас абмеркавання праекта ўказа.

Дакумент прадугледжвае таксама адыход ад сістэмы планавых праверак, у рамках якой наведаць суб'ект гаспадарання можна нават пры адсутнасці ім парушэнняў. Акрамя гэтага, кантралёр не можа выносіць прадпісанне аб прыпыненні дзейнасці правяраемага суб'екта гаспадарання — толькі адпаведныя рэкамендацыі. Улічваць іх ці не — вырашае ўласнік.

«Мы таксама дамаўляліся пра тое, што правяраць будзем толькі тады, калі ўзбуджана крымінальная справа. У нас зараз практыка такая: з'явіліся нейкія матэрыялы, яшчэ да крымінальнай справы ідуць праверачныя мерапрыемствы праваахоўных органаў, яны звяртаюцца да вас з даручэннямі, просьбамі — маўляў, давайце будзем правяраць гэты суб'ект гаспадарання. Не. Узбудзілі крымінальную справу — яна ўжо на кантролі — вось тады і правярайце. Тады можна пракантраляваць работу і праваахоўных органаў, і работу кантралёра», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Указ Прэзідэнта «Аб змяненні ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» датычыцца ўдасканалення парадку ліцэнзавання. Дакумент прадугледжвае, што ліцэнзаванне патрэбна толькі ў мэтах абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, навакольнага асяроддзя, жыцця, здароўя, правоў і законных інтарэсаў грамадзян. Са студзеня мы адмовімся ад ліцэнзавання дзейнасці па аказанні псіхалагічнай дапамогі, паліграфічнай, звязанай з кантролем за радыеактыўным забруджваннем, рознічнага гандлю алкагольнымі напоямі і тытунёвымі вырабамі, а таксама дзейнасці па аказанні юрыдычных паслуг (выключэнне — рыэлтарская дзейнасць).

Да арганізацыі — саіскальніка ліцэнзіі — змяншаецца колькасць патрабаванняў, а з 1 ліпеня 2018 года адбудзецца пераход на электронны фармат выдачы ліцэнзій.

## Без карупцыйнай спакусы

Не абышлося без карэкціроўкі заканадаўства і ў падатковай сферы. Гэтаму прысвечаны Указ Прэзідэнта «Аб падатковым кансультаванні ў Рэспубліцы Беларусь». Дакумент накіраваны на ўкараненне прафесійнага інстытута пасрэднікаў паміж бізнесам і падатковымі органамі. Такім чынам, замацоўваецца прававы статус падатковага кансультанта і ўстанаўліваецца парадак яго набыцця. Так, фізічная асоба мае права займацца кансультаваннем пасля здачы кваліфікацыйнага экзамену ў Міністэрстве па падатках і зборах і атрымання атэстата падатковага кансультанта, які дзейнічае бестэрмінова.

Падчас падрыхтоўкі гэтага дакумента кіраўнік дзяржавы выказаў наступнае пажаданне міністру па падатках і зборах Сяргею Налівайку: «Хацелася б, каб вы асаблівую ўвагу звярнулі на экспертызу карупцыйнасці гэтага закона. Што мяне насцярожвае: у нас ёсць падатковая інспекцыя, якая так ці інакш нешта падказвае, кансультуе, калі некаму незразумела... Каб мы не легалізавалі платную дзейнасць вашых падначаленых: яны будуць браць грошы, а пасля забудуць, што яны — людзі дзяржаўныя. Трэба на дзяржаву працаваць, а яны пойдуць за грошы кансультаваць, а яшчэ і прасоўваць некага».

## З паблажкамі праблем не будзе?

Пра Указ Прэзідэнта «Аб стварэнні ўмоў для развіцця гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва» мы ўжо пісалі падрабязна. Акцэнт там — на развіццё прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці.

А вось Указ Прэзідэнта «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб» скіраваны ў першую чаргу на развіццё самазанятасці грамадзян. Ён пашырае шэраг відаў эканамічнай дзейнасці, якія не з'яўляюцца прадпрымальніцтвам і якімі людзі могуць займацца пры ўмове выплаты адзінага падатку. У гэты шэраг прапануецца ўключыць работы па рамонце гадзіннікаў і абутку, зборцы і аднаўленні хатняй мэблі, розныя віды аддзелачных работ, распіл дроў, пагрузку грузаў, пашыў адзення...

Прыкладна гэтаму ж прысвечаны Указ Прэзідэнта, які датычыцца развіцця рамесніцкай дзейнасці. Ён прадугледжвае пашырэнне спіса відаў рамесніцкай дзейнасці, а таксама месцаў і спосабаў яе рэалізацыі. Таксама ўстанаўліваецца магчымасць перадачы невыкарыстоўваемай маёмасці, што знаходзіцца ў рэспубліканскай або камунальнай уласнасці, у бязвыплатнае карыстанне рамеснікам. У гэтым ключы Аляксандр Лукашэнка заўважыў міністру эканомікі Уладзіміру Зіноўскаму: «Мяне насцярожвае, калі вы вось так свабодна імкняцеся за нейкую адну базавую велічыню дзяржаўную ўласнасць некаму перадаць — нібыта ў нас ёсць праблемы з прыняццем падобных рашэнняў. Думаю, нам нельга разбазарваць дзяржаўную ўласнасць. Трэба вельмі акуратна ставіцца да прыватызацыі — гэта фактычна прыватызацыя — дзяржаўнай уласнасці. І нельга ее дзяліць на дарагую, танную, вялікую, малую — гэта створана народам, і тут нам трэба быць вельмі акуратнымі і асцярожнымі».

> **Яшчэ адзін дакумент пакета па лібералізацыі бізнесу датычыцца развіцця аграэкатурызму. Самае істотнае яго новаўвядзенне — прадастаўленне суб'ектам аграэкатурызму права аказваць шэраг дадатковых паслуг у сферы аграэкатурызму, у тым ліку праводзіць вяселлі, банкеты і юбілеі.**

## Адказнасць непазбежная, але справядлівая

Асобны заканадаўчы акт рэгулюе дзейнасць Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў нашай дзяржаве. А праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях» ліквідуе адміністрацыйную адказнасць суб'ектаў гаспадарання за малазначныя дзеянні і фармальныя памылкі. Акрамя гэтага, зніжаецца памер маёмасных спагнанняў за здзяйсненне шэрагу эканамічных правапарушэнняў.

Вадзім Іпатаў, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, расказаў, што прыняцце названага законапраекта, які ён абараняў перад кіраўніком дзяржавы, сыграе станоўчую ролю ў паляпшэнні бізнес-клімату ў краіне. «Прэзідэнт падкрэсліў важнасць гэтага дакумента і вызначыў асноўны пасыл, які павінен выконвацца пры далейшай рабоце са згаданым праектам. Гэта баланс інтарэсаў дзяржавы і грамадства. Значыць, адміністрацыйная адказнасць павінна быць жорсткай, непазбежнай, але справядлівай», — упэўнены Вадзім Іпатаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by

АКТУАЛЬНЫ КАМЕНТАРЫЙ

# ЗА ЎСЁ АДКАЖА КІРАЎНІК

На думку **Сяргея НАВІЦКАГА, генеральнага дырэктара сумеснага прадпрыемства «Хенкель Баутэхнік»**, нормы Указа №376 можна ацаніць як станоўчыя. Згодна з ім на найбліжэйшы час адмяняюцца планавыя праверкі і адбудуцца толькі тыя, для якіх ёсць аператыўныя даныя. Больш за тое, калі праверка прызначаецца, яна будзе насіць комплексны характар. «Раней усе службы прыходзілі асобна, а цяпер прыйдуць разам і за адзін раз праверадзь і МНС, і падатковая, і санітарна-эпідэміялагічная», — кажа прадпрымальнік. Да таго ж, калі праверка была прызначана, а насамрэч неабходнасці ў гэтым не было і канкрэтных парушэнняў няма, то адміністрацыйную адказнасць будзе несці чыноўнік, які яе ініцыіраваў.



На пытанне, ці адбіваецца змяншэнне колькасці праверак на рабоце яго прадпрыемства, Сяргей Навіцкі адказвае так: «Па шчырасці, вялікай розніцы не адчуваю. Ды і раней да нас не часта прыходзілі. Гэта, хутчэй, датычыцца тых, хто звязаны з грамадскім харчаваннем і ўвогуле здароўем людзей, — напрыклад, медыцынскіх кампаній. У нас жа за апошні год была адна праверка. Я не адчуваю сур'ёзных праблем з гэтым. Акрамя таго, казаць пра адчувальныя змены заўчасна, бо пакуль указ не ўступіў у сілу».

Генеральны дырэктар адзначае і такую станоўчую змену. Раней, калі праверка выявіла нейкія неадпаведнасці ці парушэнні, то санітарныя і пажарныя службы маглі спыніць работу прадпрыемства, рахунак магла закрыць падатковая, а вось зараз такая мера выкарыстоўвацца не будзе. «Цяпер выносіцца папярэджанне кіраўніку, і ён сам прымае рашэнне, спыняць яму дзейнасць ці не, выпраўляць парушэнне ці не. Але калі ён не выправіць яго за пэўны час, то, вядома ж, панясе адказнасць. Сёння знаходжанне парушэнняў падчас праверкі не з'яўляецца фактам прыпынення дзейнасці прадпрыемства».

Па словах Сяргея Навіцкага, спіс маючых адбыцца праверак можна знайсці на сайце Камітэта дзяржаўнага кантролю, які іх публікуе. Такім чынам кіраўнік прадпрыемства можа сам даведацца, калі да яго прыйдуць і з якімі пытаннямі. А значыць, загадзя падрыхтавацца. Праўда, за допушчанае парушэнне несці адказнасць (якая таксама павышаецца) зноў жа давядзецца менавіта кіраўніку.

Акрамя таго, згодна з указам будзе аптымізаваны пералік кантрольных (наглядных) органаў і сфер іх дзейнасці, у выніку чаго паўнамоцтвы на правядзенне праверак страціць трыццаць кантралёраў, а колькасць сфер кантрольнай (наглядной) дзейнасці скароціцца амаль удвая.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# БОЛЬШ СВАБОДЫ — БОЛЬШ АДКАЗНАСЦІ

## Падрабязна аб тым, як памяншэнне праверак зменіць жыццё бізнесменаў

**Усярэдзіне кастрычніка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №376 «Аб мерах па ўдасканаленні кантрольнай (нагляднай) дзейнасці». Гэта адзін з тых дакументаў, што мусяць разняволіць беларускі бізнес. Згодна з указам, цяпер акцэнт з пакарання за здзейсненае парушэнне змесціцца на яго прафілактыку.**
**Аб тым, як змены адаб'юцца на айчынных прадпрымальніках, нам расказала начальнік упраўлення каардынацыі дзейнасці кантрольных (наглядных) органаў Рэспублікі Беларусь Камітэта дзяржаўнага кантролю Данута РЫЖЫКАВА.**



***— Якія прафілактычныя меры прадугледжвае нядаўна падпісаны Указ Прэзідэнта №376? Ці ўскладзе гэта на кантрольныя і наглядныя органы дадатковую нагрузку? І як гэта адаб'ецца на прадстаўніках бізнес-супольнасці?***

— Змены ў заканадаўстве аб кантрольнай (нагляднай) дзейнасці, перш за ўсё, накіраваныя на прафілактыку і папярэджанне парушэнняў. У прыватнасці, прадугледжаны шэраг мер, якія дазволяць істотна знізіць праверачную нагрузку на суб'екты гаспадарання, выключыць правядзенне праверак добрасумленных, нармальна працуючых арганізацый.

> Важнай асаблівасцю Указа Прэзідэнта №376 з'яўляецца сыход ад правядзення планавых праверак.

Напрыклад, папераджальна-прафілактычную накіраванасць атрымаюць мерапрыемствы тэхнічнага (тэхналагічнага, праверачнага) характару. У новым заканадаўстве не дапускаецца правядзенне праверак па пытаннях, якія адносяцца да мерапрыемстваў тэхнічнага (тэхналагічнага, праверачнага) характару. Пры выяўленні ў ходзе названых мерапрыемстваў парушэнняў кантрольныя (наглядныя) органы будуць выносіць суб'екту гаспадарання патрабаванне (прадпісанне) аб ліквідацыі парушэнняў, а меры адказнасці за гэтыя парушэнні змогуць прымяняць толькі ў выпадку іх неліквідацыі альбо паўторнага дапушчэння.

Таксама больш увагі будзе ўдзяляцца правядзенню маніторынгаў, па выніках якіх суб'екту гаспадарання накіроўваюцца рэкамендацыі па ліквідацыі і недапушчэнні выяўленых недахопаў.

Суб'екты, якія правяраюцца, будуць інфармавацца аб тыповых парушэннях. Указ №376 прадугледжвае правядзенне растлумачальнай работы аб парадку выканання патрабаванняў заканадаўства, прымянення яго палажэнняў на практыцы, у тым ліку і з дапамогай семінараў і круглых сталоў з прадстаўнікамі бізнес-супольнасці.

На папярэджанне магчымых парушэнняў таксама накіравана патрабаванне аб абавязковым выкарыстанні кантрольных спісаў пытанняў (чэк-лістоў) усімі дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі), якія ажыццяўляюць нагляд у форме праверак. Яно ўводзіцца з 1 студзеня 2018 года. Кантрольны спіс пытанняў (або чэк-ліст) — гэта вычарпальны пералік патрабаванняў, якія могуць быць прад'яўлены да правяраемага суб'екта. Таму кожны суб'ект гаспадарання, не чакаючы праверкі, зможа самастойна ацэньваць адпаведнасць сваёй дзейнасці патрабаванням заканадаўства і прымаць меры па ліквідацыі хібаў і іх далейшым недапушчэнні.

Усе гэтыя мерапрыемствы павінны стаць неад'емным і адным з найважнейшых складнікаў у дзейнасці кантрольных і наглядных органаў.

***— Якая тэндэнцыя апошніх гадоў: колькасць праверак у Беларусі памяншаецца або павялічваецца?***

— У Беларусі на працягу апошніх сямі гадоў захоўваецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння колькасці праверак. Напрыклад, у 2016 годзе колькасць праведзеных праверак у параўнанні з 2010-м зменшылася на 48%, з 2013-м — на 18%, з 2015-м — на 13%.

З улікам мерапрыемстваў па ўдасканаленні кантролю і нагляду, якія праводзяцца ў краіне, у бягучым годзе асобныя кантрольныя і наглядныя органы ўжо перабудавалі сваю работу і значна знізілі праверачную нагрузку на суб'екты гаспадарання. Так, агульная колькасць праведзеных праверак за дзевяць месяцаў гэтага года праверак у параўнанні з адпаведным перыядам 2016 года знізілася практычна напалову (на 48,4%).

***— Якія (згодна з указам) павінны быць падставы для правядзення пазапланавых праверак? Дзе прадпрымальніку можна будзе знайсці план будучых выбарачных праверак?***

— Важнай асаблівасцю Указа Прэзідэнта №376 з'яўляецца сыход ад правядзення планавых праверак. З новага года ў краіне будуць праводзіцца толькі пазапланавыя праверкі, а з 1 студзеня 2019 года прадугледжана правядзенне выбарачных праверак. Прычым значна ўзмацняюцца падставы для прызначэння праверак. Напрыклад, прызначэнне пазапланавай праверкі будзе магчыма, у асноўным, пры наяўнасці інфармацыі аб здзейсненым парушэнні заканадаўства або аб фактах узнікнення пагрозы бяспецы дзяржавы, жыццю і здароўю грамадзян, выкарыстання суб'ектам бюджэтных сродкаў, дзяржаўнай маёмасці. Пры гэтым пазапланавая праверка абмяжоўваецца вывучэннем толькі тых пытанняў, якія сталі падставай для яе правядзення.

> У Беларусі на працягу апошніх сямі гадоў захоўваецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння колькасці праверак.

Што датычыцца выбарачных праверак, то яны будуць прызначацца кантрольнымі і нагляднымі органамі па сукупнасці вынікаў аналізу існуючай у іх распараджэнні інфармацыі, якая сведчыць аб высокай ступені рызыкі парушэнняў заканадаўства і іх негатыўных наступстваў.

План выбарачных праверак будзе фарміравацца Камітэтам дзяржаўнага кантролю пачынаючы з першага паўгоддзя 2019 года і размяшчацца на яго сайце ў інтэрнэце. Інфармацыя аб праверках, якія маюць адбыцца, будзе адкрыта і даступная для суб'ектаў гаспадарання.

***— Новы ўказ дае бізнесу значна больш свабоды. Як гэта адаб'ецца на адказнасці кіраўнікоў прадпрыемстваў?***

— Недапушчэнне ўмяшання кантрольных і наглядных органаў у дзейнасць суб'екта прадугледжвае неабходнасць развіцця ўнутранай сістэмы самакантролю арганізацый і павышэння адказнасці кіраўніка за рашэнні, якія ім прымаюцца.

Напрыклад, пры наяўнасці адпаведных падстаў кантралёр можа накіраваць суб'екту прапанову (але не патрабаванне) аб прыпыненні яго дзейнасці, якая будзе насіць рэкамендацыйны характар. Але рашэнне аб прыпыненні дзейнасці аб'екта альбо яе працягу кіраўнік будзе прымаць самастойна. Пры гэтым і адказваць за прынятае рашэнне і наступствы давядзецца яму самому.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*



МЕРКАВАННІ

# Ці дастаткова, на ваш погляд, існуючых умоў для развіцця бізнесу?

**З такім пытаннем мы звярнуліся да людзей, якія маюць дачыненне да беларускага прыватнага прадпрымальніцтва.**

**Старшыня Лунінецкага раённага Савета дэпутатаў Віктар РАФАЛОВІЧ:**

— На мой погляд, дастаткова. У нас вельмі дэмакратычнае заканадаўства, тым больш з выхадам новага ўказа з'яўляецца яшчэ большы прастор для работы бізнесменаў. Зараз прыватнаму прадпрымальніцтву нічога не перашкаджае, падаткаабкладанне ў нас нармальнае. Мы вельмі хочам, каб да нас прыходзілі новыя прадпрымальнікі. Каго нам не хапае? У першую чаргу, гэта бытавыя паслугі ў вёсках, а таксама аб'екты грамадскага харчавання. Нам патрэбны цырульні, патрэбны рамонтныя майстэрні... Прыходзьце і працуйце, для гэтага ўсё ўжо зроблена. Мне складана даваць прагнозы, але будзем спадзявацца, што прадпрымальнікі адгукнуцца. Мне здаецца, што мы і так ідзём на ўступкі, таму дзіўна казаць аб нейкіх дадатковых паслабленнях.

**Выканаўчы дырэктар Саюза юрыдычных асоб «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва» Кацярына МІКУЦКАЯ:**

— Не, недастаткова. Чаму? Перш за ўсё, у нас паранейшаму высокія арэндныя стаўкі. Акрамя таго, сапраўды не хапае высокакваліфікаваных рабочых кадраў. Гэта датычыцца менавіта прадпрыемстваў, а не супрацоўнікаў дзяржаўных органаў — тымі людзьмі, з якімі мы сутыкаемся, мы задаволеныя. Што яшчэ? Залішнія адміністрацыйныя працэдуры. Існуе пастаянная валакіта, усе дзеянні займаюць вельмі шмат часу. Як гэта ўсё выправіць? Трэба працаваць над кожным пунктам, чым займаецца як наша арганізацыя, так і іншыя. Мы спрабуем пазбавіцца ад гэтых праблем. Што рабіць з нізкім узроўнем кадраў? Ёсць розныя спосабы: мы праводзім семінары, трэнінгі, запрашаем вядомых бізнесменаў, трэнераў. Гэта цяжка выправіць хутка, павінен быць комплексны падыход.

**Першы віцэ-старшыня грамадскага аб'яднання «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і работадаўцаў» Віктар МАРГЕЛАЎ:**

— Не паверыце, я якраз пішу пра тое, што трэба рабіць, каб бізнес рэальна развіваўся. Вядома, таго, што ёсць, недастаткова. Усё, што прынята цяпер, — гэта толькі ўмацаванне падмурка беларускага бізнесу. Але нам трэба будаваць сцены і дах, а для гэтага патрэбна праграма. Вынікам усяго гэтага павінна быць бурнае развіццё дзейнасці суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Я гэтага не назіраю, работы яшчэ вельмі шмат. Перш за ўсё, трэба скончыць фарміраванне базавых умоў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці. Гэта пытанні абароны правоў уласнасці, бо сёння нярэдка адбываюцца канфіскацыі. Далей, у нас велізарныя рызыкі пры рэалізацыі бізнесу, звязаныя, напрыклад, з ілжэпрадпрымальніцтвам. Вось працуе бізнесмен, а потым аказваецца, што фірма, з якой ён супрацоўнічаў 10 гадоў таму, была лжэфірмай. І зараз гэты прадпрымальнік павінен заплаціць немаленькія падаткі, таму што 10 гадоў таму ён з ёй працаваў... Абвастраецца блок падатковых пытанняў. Афіцыйна стаўкі не растуць, але рэальная падатковая нагрузка значна павялічваецца ў сувязі з увядзеннем электронных рахункаў-фактур па падатку на дабаўленую вартасць.

**Начальнік аддзела эканомікі Чавускага раённага выканаўчага камітэта Ірына ЛОСЕВА:**

— Я лічу, што ў нас усяго хапае. Бюракратычных пытанняў няма, усё робіцца хутка і аператыўна. Напрыклад, я займаюся рэгістрацыяй — і магу сказаць, што ўсе працэдуры займаюць па часе адзін дзень. Прыходзіць прыватны прадпрымальнік — у той жа дзень мы яго рэгіструем. Праз пяць дзён ён вяртаецца, каб забраць паведамленне аб пастаноўцы на ўлік у іншых органах. Атрымліваецца, бізнесмену нікуды нават хадзіць не трэба. Але я адказваю толькі за сваю службу, у іншых могуць быць свае пытанні. Галоўнае — гэта ініцыятыўныя людзі, якія гатовыя працаваць. Ці часта адкрываюць бізнес у нас? Апошнім часам не надта часта. Сёлета зарэгістравана шэсць прыватных прадпрыемстваў. Але магу сказаць, што ў нас усе, хто хацеў, даўно адкрыліся. Прыходзяць прадпрыемствы з іншых гарадоў — такіх у нас чатыры. Літаральна сёння да нас прыйшла прыватная арганізацыя. Але ўсё ўпіраецца ў фінансы, таму буйных прадпрыемстваў у нас няма, толькі невялікія. Я ўпэўнена, хто захоча — той зробіць. Нам трэба развіваць бізнес у сферы паслуг, а гандлёвых пунктаў хапае.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

РЭАЛЬНЫ РЫНАК

# УЗАКОНЕНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## Гродзенскі прадпрымальнік прагназуе новы вiток у развіцці бізнесу і інтэрнэт-рэкламы

**Сваю задумку Ігар Чывель ажыццявіў 10 гадоў таму. У гэты час прадпрымальніцкая дзейнасць пачала ўваходзіць у прававое рэчышча, спатрэбіліся веды адпаведных спецыялістаў, каб правільна афармляць дакументацыю. Тады Ігар і задумаў стварыць платформу для аказання дапамогі малому бізнесу. Цяпер у яго фірме каля 30 супрацоўнікаў, якія вядуць дакументацыю некалькіх сотняў прадпрымальнікаў.**

— Прадстаўнікі бізнесу зразумелі, што значна больш выгадна звярнуцца да паслуг кваліфікаваных спецыялістаў, чым трымаць у сваім штаце пастаяннага бухгалтара, — адзначае Ігар Чывель. — Тым, хто мае сваіх спецыялістаў, мы дазваляем карыстацца базай нашага сервера. Купляць ліцэнзійныя праграмы вельмі дорага, але мы на гэта ідзём, каб забяспечыць бізнесу шырокае прававое поле.

Дзякуючы актыўнай пазіцыі на базе фірмы створаны Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва. Гэты статус рэгіструе міністэрства эканомікі, каб спрыяць развіццю малога бізнесу. Цяпер сюды можна звярнуцца па бясплатную кансультацыю. У Цэнтры, напрыклад, распрацавалі падрабязную методыку па адкрыцці свайго бізнесу па кожным відзе дзейнасці. Тут сабрана самая актуальная інфармацыя па формах уласнасці, адрасы і тэлефоны службаў па рэгістрацыі прадпрыемства, правілы пераводу жылых памяшканняў у нежылыя, умовы крэдытавання, сертыфікацыі прадукцыі, падаткаабкладання і многае іншае.

Прадпрымальныя жыхары рэгіёна часта звяртаюцца ў Цэнтр падтрымкі з пытаннямі. Кірункі самыя розныя. Найбольш «хадавымі» застаюцца гандаль і сфера паслуг.

— Кожны дзень нашы супрацоўнікі атрымліваюць па 4—5 такіх зваротаў, — канстатуе Ігар Чывель, — хоць раней было значна больш. Цяпер назіраецца спад дзелавой актыўнасці.

Паступова гэта дзейнасць пераходзіць на электронную платформу, адзначае Андрэй Чывель. Па яго словах, інтэрнэт значна пашырыў магчымасці рынку. Напрыклад, спажывец задумаў купіць канапу. Каб здзейсніць сваю мэту, яму, у лепшым выпадку, спатрэбіцца аб'ехаць не адну гандлёвую кропку. А можна падключыць сюды пошукавую сістэму інтэрнэту, якая дасць магчымасць убачыць розныя мадэлі канапаў і іх кошт. Здзейсніць пакупку таксама можна ў віртуальнай прасторы. Гэта зручна як прадаўцам, так і пакупнікам.

— Значная частка прадпрымальнікаў пачала карыстацца інтэрнэтам у рэкламных мэтах. Без гэтага многія не ўяўляюць сваю дзейнасць. А наша фірма прапануе неабходнае праграмнае забеспячэнне. Мы кансультуем: куды звярнуцца, якія дакументы патрэбны, якую сістэму падаткаў прыняць, каб знаходзіцца ў прававым полі, — кажа Ігар Чывель. — Ад таго, як прадстаўлены тавар ці паслуга, будзе залежаць і эканамічны стан прадпрыемства.



**Пераход на электронную платформу зніжае папулярнасць звычайных рынкаў, лічыць прадпрымальнік. Некаторыя губляюць частку сваіх кліентаў. Разам з гэтым пашыраецца кола бізнесменаў, якія працуюць праз інтэрнэт. Менавіта гэта катэгорыя цяпер найбольш актыўная. Па словах суразмоўніка, інтэрнэт-кірунак будзе развівацца. Згодна з новым указам, многія майстры змогуць рэкламаваць свае ўласныя тавары на інтэрнэт-рэсурсах. Да гэтага часу яны былі пазбаўлены такой шырокай аўдыторыі.**

Тое, што ў краіне вядзецца работа па лібералізацыі бізнесу, павінна значна палепшыць дзелавое асяроддзе, лічыць Ігар Чывель. Літаральна за апошнія месяцы кіраўніком краіны прынята некалькі важных указаў, якія пачнуць дзейнічаць напачатку будучага года. Яны накіраваны на стварэнне ўмоў для самазанятасці. Гэта дазволіць значна пашырыць як віды дзейнасці, так і кола грамадзян, уцягнутых у эканоміку. Многім не спатрэбіцца рэгістравацца ў якасці прадпрымальнікаў. Без рэгістрацыі змогуць рэалізаваць сваю прадукцыю кандытары, будуць аказваць паслугі швачкі, маляры, цырульнікі, спецыялісты па рамонце камп'ютараў і прадстаўнікі многіх іншых прафесій. Для іх прадугледжаны і больш нізкія стаўкі адзінага падаходнага падатку. Гэта спросціць уваход спецыялістаў у любы бізнес, дазволіць ім самім стаць больш актыўнымі.

Суразмоўнік прыводзіць такі прыклад. На прадпрыемстве праходзіць аптымізацыя, ці наогул яно ліквідуецца. Куды пайсці спецыялісту? Вось тут і можа дапамагчы новы ўказ, згодна з якім чалавеку даецца магчымасць сябе рэалізаваць.

Пашыраецца магчымасці ў прадпрымальнікаў, якія працуюць у сферы гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання ў сельскай мясцовасці. Для іх будуць створаны больш спрыяльныя ўмовы.

**Рэвалюцыйным крокам Ігар Чыкель лічыць новы ўказ па скарачэнні праверак у малым бізнесе. Кантрольныя органы павінны не караць, што называецца, «з парога», а даваць парады, уносіць прапановы. Аказалася, кантрольнымі функцыямі надзелены каля 40 ведамстваў і арганізацый. Іх колькасць вырашана скараціць. Гэта выведзе бізнес на легальны ўзровень, бо многія працуюць у «шэрых» схемах, не плацяць падаткі менавіта таму, што баяцца праверак.**

— Раней ледзь што — адразу штраф, канфіскацыя, — тлумачыць Ігар Чывель, — таму і бізнес хаваўся ў цень. Працэй было ўвогуле не весці дакументаў. Новыя ўказы спрашчаюць вядзенне бізнесу. Асабліва гэта датычыць тых, каму будзе дазволена не рэгістравацца як ІП. Яны таксама могуць працаваць у прававым рэчышчы і плаціць падатак. Многія раней не плацілі падатак, а працавалі нелегальна.

**У сувязі з гэтым можа ўзнікнуць пытанне: а ці будуць якаснымі паслугі, якія амаль ніхто не кантралюе? Тут ужо выбар, як кажуць, за спажыўцом. Ён будзе выбіраць, каму аддаваць перавагу. Больш таннаму майстру альбо сертыфікаванаму прадпрыемству, чые тавары ці паслугі будуць даражэйшыя.**

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

ДАПАМАГЧЫ ПРЫРОДЗЕ

# Зноў зарыбілі Дняпро. Цяпер шчупаком

**У раёне Дуброўна адбылося чарговае зарыбленне трансгранічнага ўчастка Дняпра шчупаком. У раку ўсялілі 1530 кілаграмаў сяголетка ў гэтай рыбіны (каля 6,1 тысячы асобін), а таксама 150 кілаграмаў падрошчанай сцерлядзі (370 экзэмпляраў).**

Рыбапасадачны матэрыял быў закуплены Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў на сродкі ад членскіх узносаў у рыбгасе «Волма» Чэрвеньскага раёна. Апроч прадстаўнікоў афіцыйных структур паўдзельнічаць у зарыбленні запрасілі і школьнікаў, каб беражлівае стаўленне да жывой прыроды фарміравалася ў дзяцей з ранніх гадоў. Цяпер месца зарыблення знаходзіцца пад пільным наглядам дзяржінспектараў. Прамысловага памеру (40 сантыметраў) уселены шчупак можа дасягнуць ужо да другога года жыцця. Чырванакніжная сцерлядзь, раней звычайная дняпроўская рыба, пакуль усяляецца для аднаўлення папуляцыі.

У маі паблізу вёскі Холаўе Дубровенскага раёна ўжо праводзілася зарыбленне Дняпра. У рыбалоўныя ўгоддзі было выпушчана каля 1,5 тысячы асобін сцерлядзі агульнай вагой 300 кілаграмаў. Рыбапасадачны матэрыял прывезлі з доследнага рыбгаса «Белае» Жыткавіцкага раёна таксама закуплены на сродкі рыбакоў, выдзеленых Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў з членскіх узносаў.

**Ініцыятарам зарыблення выступае Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У жніўні 2016 года дзяржінспектары зафіксавалі наступствы маштабнага замору рыбы, які здарыўся з-за анамальнай спякоты ў вярхоўях Дняпра на тэрыторыі Расіі. Некалькі дзён уніз па цячэнні ракі плыла мёртвая рыба — тысячы асобін былі сабраныя і ўтылізаваныя. Спецыялісты Дзяржінспекцыі правялі перамовы з калегамі з Расрыбалоўства і дасягнулі дамоўленасці, што ў 2017 годзе Дняпро будзе зарыбляцца абодвума бакамі.**

Надалей раку будуць зарыбляць таксама шчупаком і судаком. Згодна з біялагічным абгрунтаваннем, у наступныя год-два на тэрыторыі Беларусі плануецца ўсяліць каля 7 тысяч асобін шчупака, 3,5 тысячы асобін судака і яшчэ каля дзвюх тысяч асобін сцерлядзі. Расіяне таксама правялі ў кастрычніку масавае зарыбленне шчупаком трансгранічнага ўчастка Дняпра ў Смаленскай вобласці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Бярэш хабар — за краты

### Інспектар гандляваў ліпавымі даведкамі

**Строга асуджаны дзяржаўны інспектар Воранаўскай райінспекцыі па насенняводстве, каранціне і абароне раслін за дазвол на нелегальныя пастаўкі санкцыйнай прадукцыі.**

Амаль два гады галоўны аграном Воранаўскай райінспекцыі Аляксандр Ш. браў хабар у прадпрымальнікаў за выдачу фітасанітарных сертыфікатаў на прадукцыю, якая адпраўлялася ў Расійскую Федэрацыю. Зразумела, што ніякага агляду, адбору пробаў і аналізу падкаранцiннай прадукцыі не рабілася. За гэты час Аляксандр Ш. атрымаў ад васьмі прадпрымальнікаў грашовых сродкаў на суму амаль 8 800 рублёў. Ім было выдадзена 1037 незаконных сертыфікатаў, паведаміў начальнік Лідскага міжраённага ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Гродзенскай вобласці Андрэй Лагуноў.

Воранаўскі раённы суд прызнаў фітасанітарнага інспектара вінаватым у атрыманні хабару. Ён асуджаны на пяць гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Адбываць тэрмін пакарання Аляксандр Ш. будзе ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму. Таксама былы інспектар пазбаўляецца права займаць пасады, якія звязаны са значнымі юрыдычнымі абавязкамі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# СПРАВАЙ ПАВІННЫ ЗАЙМАЦЦА НЕ ДЫЛЕТАНТЫ...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У пункце 4 гэтай Пастановы ідзе размова пра тое, што сельскія ўлады павінны ўскладаць на старастаў населеных пунктаў абавязкі па кантролі за своечасовым уключэннем і адключэннем вонкавага асвятлення, фактычна выкананым аб'ёмам работ па замене лямпаў вонкавага асвятлення, а таксама абавязаць іх займацца «своечасовым і дакладным зніманнем паказанняў разліковых прыбораў уліку спажытай электраэнергіі». Ад старастаў таксама патрабуецца, каб яны прайшлі падрыхтоўку ў арганізацыі энергазабеспячэння і атрымалі групу па электрабяспецы.

— Гэтыя інструкцыі быццам нейкі жарт, — не хавае свайго скептычнага стаўлення **старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр ЕМЯЛЬЯНАЎ.** — Атрымліваецца, электралініі, апоры і свяцільнікі — гэта маёмасць энергетыкаў, за лямпачкі і электраэнергію плацім мы, а ўлік, кантроль і зніманне паказанняў павінны весці старасты. Але гэта ж не спецыялісты, да таго ж часцей за ўсё людзі сталага ўзросту, якіх часта і зрок падводзіць, і сілы не тыя, што ў маладога. А ёсць вёскі, дзе са старастамі наогул праблема. Вунь у нас у васьмі населеных пунктах ніводнага жыхара не зарэгістравана — усе дачнікі. Яшчэ ў 20 жыве ад аднаго да чатырох чалавек. І не факт, што яны там пастаянна знаходзяцца. На зіму іх звычайна дзеці забіраюць. Я звярнуў на гэту супярэчнасць увагу міністэрства. Але там не палічылі патрэбным нешта пераглядзець.

> Усё перавярнулася з ног на галаву. Назіральныя камісіі як суб'ект прафілактыкі — гэта добра, але не трэба гэтым злоўжываць.

**Старшыня Глушанскага сельскага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна Марыя СУШЧАНКА** таксама лічыць, што нельга ўскладаць такую адказнасць на неспецыялістаў.

— На сённяшні дзень энергетыкі вызвалены ад падаткаў на зямлю, нерухомасць, але гэта адзіная арганізацыя, якая ігнаруе рэкамендацыі органаў мясцовай улады па паляпшэнні якасці жыцця насельніцтва, — кажа яна. — Многія ўчасткі вёсак дрэнна асветлены, ёсць вуліцы, дзе наогул няма ніводнага ліхтара. Незразумела, чым энергетыкі кіраваліся, калі асвятлялі вуліцы. І навошта нам плаціць за ўстаноўку новых апор асвятлення, дзе яны іх проста своечасова не паставілі? Не разумею, чаму сельвыканкамы павінны кампенсаваць выдаткі на лямпачкі, якія купляюць і ўтылізуюць выключна энергетыкі. Мы нават не ведаем, спраўныя нам прапануюць лямпачкі або не. Часта бывае так, што яны цераз пару дзён перагараюць... Лічу, што сельвыканкамы павінны плаціць толькі за спажытую электраэнергію і болей ні за што. А за якасць хай адказваюць спецыялісты.

— У нас сістэма гадамі адладжаная, мы добра ўзаемадзейнічаем з энергетыкамі, але ёсць пытанні, — адзначае **старшыня Язёрскага сельскага Савета дэпутатаў Чэрыкаўскага раёна Зоя РЫЖКОВА.** — Узяць, напрыклад, вулічнае асвятленне. Старасты ў нас добрасумленныя, дапамагаюць і нам, і энергетыкам. Дзесьці лямпачка перагарэла або нешта зламалася, — адразу ж сігналізуюць. Мы гэтыя заяўкі афармляем і перадаём у раённыя электрычныя сеткі. Але са зніманнем паказанняў яўны перабор. Гэта ж трэба ісці да камплектнай трансфарматарнай падстанцыі (ктп), адкрываць яе спецыяльным ключом і глядзець. А калі нешта здарыцца з чалавекам, хто будзе адказваць? Мы знайшлі такое выйсце — паставілі рэле часу, якое трэба двойчы ў месяц пераводзіць. Гэта мае права рабіць толькі спецыяліст з раённых электрычных сетак. Я бяру яго і вязу па ўсіх населеных пунктах сельсавета, дзе ёсць ктп і тп (трансфарматарная падстанцыя). Па сутнасці, два дні ў месяц працую проста кіроўцам замест таго, каб займацца непасрэдна насельніцтвам.



Падчас пасяджэння Савета грамадскага пункта аховы правапарадку.

Пастанаўленне звязвае рукі самім жа энергетыкам. Калі трэба памяняць лямпачку або зрабіць нейкі рамонт, яны — пакуль не адпрацуюць па адным сельсавеце, пакуль усе паперы не аформяць, разлік не выставяць — у другі сельсавет нават не заязджаюць. А калі б яны самі сачылі за сваім абсталяваннем, то маглі б заязджаць па дарозе ў вёскі, незалежна ад іх прыналежнасці таму ці іншаму сельсавету. Меней паліва спатрэбілася б і менш стала б папяровай работы. І нам не трэба было б ім плаціць за паслугі, а значыць болей грошай заставалася б у бюджэце. А паведамляць пра перагарэлыя лямпачкі і паломкі мы будзем у любым выпадку.

## НЕ ХАПАЕ ПСІХІЯТРА?

Ёсць перакосы і ў рабоце саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку (ГПАП), якія займаюцца асацыяльнымі грамадзянамі. Міліцыянеры, сацработнікі, дэпутаты, настаўнікі і іншыя грамадскія актывісты збіраюцца разам і пачынаюць перавыхоўваць чалавека, якому глыбока абыякава грамадскае меркаванне.

— Саветы ГПАП — гэта добра, але нельга прафілактыку ўскладаць толькі на іх, — кажа Аляксандр Емяльянаў. — Ёсць РАУС, участковыя, пракуратура. Але асноўны ўхіл чамусьці робіцца на саветы ГПАП. Мне здаецца, што органы ўнутраных спраў пры аптымізацыі гэты бок крыху сказілі. Пераклалі адказнасць на плечы старшыні сельвыканкама і грамадскасці. З саветаў ГПАП запытваюць справаздачы пракуратура, міліцыя, іншыя кіруючыя органы. Але ж мы не спецыялісты.

— З тымі людзьмі, якія не зусім спіліся, яшчэ можна і патрэбна працаваць, — пагаджаецца Зоя Рыжкова. — Але, калі ў чалавека адбыліся змены ў псіхіцы, гэта бессэнсоўна. Тут эфектыўнасць грамадскасці роўная нулю. Або ўзяць людзей неадназова судзімых. Ім наогул мора па калена. Грамадскасць для іх не закон. Да таго ж яны бываюць вельмі агрэсіўныя, і невядома, чаго ад іх чакаць. З імі павінны працаваць выключна спецыялісты.

— Мы працуем з той катэгорыяй, дзе адназначна патрабуецца дапамога псіхіятра або псіхолага, — салідарная з калегамі Марыя Сушчанка. — Трэба наогул вызначыцца нарэшце — гэта хвароба або распуста. Калі хвароба, навошта мы, не спецыялісты, гэтым займаемся? Якое выйсце? Магчыма, гэта і не гуманна, але я прапаную жанчын, якія ўжо маюць дзяцей, але па-ранейшаму вядуць асацыяльны лад жыцця, стэрылізаваць, пазбаўляць магчымасці нараджаць дзяцей. Дзевяць месяцаў атручваць будучае дзіця алкаголем і наркотыкамі, заражаць венерычнымі захворваннямі — гэта хіба не злачынства? Нам патрэбны рэабілітацыйныя праграмы для такой катэгорыі людзей. Не грамадскімі ганьбаваннямі іх выхоўваць, а з дапамогай медыцыны.

## СТРАХОЎКА ДЛЯ ПЕЧКІ

Барацьба з пажарамі таксама не апошняя справа для сельсаветаў. Назіральныя камісіі робяць паўсюдны абход домаўладанняў, незалежна ад таго, асацыяльная там жыве сям'я або не.

— Раней за населенымі пунктамі былі замацаваныя інспектары МНС, — кажа Аляксандр Емяльянаў, — абыходзілі тэрыторыю, глядзелі ўсё. Але яны, як і міліцыя, пры аптымізацыі частку абавязкаў пераклалі на назіральныя камісіі — на грамадскасць іншымі словамі. Цяпер яшчэ і справаздачы з нас патрабуюць. Усё перавярнулася з ног на галаву. Назіральныя камісіі як суб'ект прафілактыкі — гэта добра, але не трэба гэтым злоўжываць.

> Не разумею, чаму сельвыканкамы павінны кампенсаваць выдаткі на лямпачкі, якія купляюць і ўтылізуюць выключна энергетыкі. Мы нават не ведаем, спраўныя нам прапануюць лямпачкі або не.

— Калі ёсць людзі спецыяльна адукаваныя, навошта прымушаць займацца гэтым дылетантаў, — не разумее Марыя Сушчанка. — І наогул, ці трэба да ўсіх хадзіць? Можа лепш увесці грамадзянскую адказнасць? Правяраць толькі там, дзе жыве вялікая колькасць народу. А калі гэта прыватны дом, то хай чалавек паклапоціцца пра сваю бяспеку сам. Магчыма, трэба ўвесці нейкую грамадзянскую адказнасць па прынцыпе, як пры страхоўцы дома. За пэўную суму спецыялісты прыйшлі і праверылі. А да тых, хто будзе ігнараваць, прымяняць якую-небудзь форму ўздзеяння. Гэта спрацуе куды больш эфектыўна, чым назіральная камісія.

— Калі ўводзіць грамадзянскую адказнасць людзей за супрацьпажарную бяспеку, гэта абавязкова трэба прапісаць у законе, — лічыць Зоя Рыжкова. — Напрыклад, пажарныя апавяшчальнікі мы ўгаворваем ставіць, бо няма такога закона, які б абавязваў насельніцтва гэта рабіць. Але калі чалавек устанавіў апавяшчальнік, а батарэйку не памяняў, ратавальнікі могуць яго аштрафаваць. Людзі, якія з гэтым сутыкнуліся, наогул адмаўляюцца ад прыбораў. Навошта ім гэты галаўны боль? А быў бы закон — і парадку стала б болей. А то працуем пакуль толькі на перакананне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

ШТО Ў ВАС НОВАГА?

## Зноў дарогі

Сёлета вырашылі заасфальтаваць участак дарогі да вёскі Навое Стрыгінскага сельсавета. Пра гэта расказаў **Вадзім ПРАТАСЕВІЧ, старшыня камісіі па экалогіі, аграрных пытаннях і добраўпарадкаванні Бярозаўскага раённага Савета дэпутатаў.** Работы пакуль не пачаліся, але такое рашэнне афіцыйна прынята. Пытанні па гатоўнасці дарог да зімы часам узнікаюць у раёне, але, па словах дэпутата, дарожныя службы хутка рэагуюць, таму праблемы не назапашваюцца. Вядома, гравійкі даволі хутка разбіваюцца, асабліва калі восенню дажджліва. Але іх своечасова раўняюць.

## Няхай будзе святло

— Мы ў асноўным, займаемся пытаннямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі — гэта асвятленне, рамонт кантэйнераў, дарог, — тлумачыць **Святлана ГАНЧАРОВА, старшыня камісіі па пытаннях сацыяльнай сферы, сацыяльнай абароны грамадзян і справах моладзі Расонскага раённага Савета дэпутатаў.** — Зваротаў у апошні час не было. Кантэйнер для вывазу смецця па нашым запыце адрамантаваны, як і частка дарогі.

Для далейшага рамонту дарогі, мабыць, не хапіла рэсурсаў. «Былі б грошы, працей было б усё». «Пытанні, якія звязаны з грашыма, вельмі цяжка нават на нашым узроўні вырашыць, — расказвае дэпутат. — Абавязкова трэба разбірацца з дарогамі, таму што ў нас у цэнтры іх стан яшчэ больш-менш. Але ўсе завулкі, маленькія вулачкі, якія адыходзяць ад цэнтральнай вуліцы, пабітыя і брудныя. Рана ці позна ўсё роўна прыйдзем да таго, што давядзецца брацца за перыферыйныя вуліцы».



Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

Асвятленне таксама вымушае жадаць лепшага. Гэта пытанне ўздымалі на пасяджэнні Савета дэпутатаў. Святло гарыць да 5 гадзін раніцы. Тым часам людзі ў 5—6 гадзін раніцы ў цемры ідуць на аўтобус, каб дабрацца да працы. Тое ж самае ўвечары: цяпер цямнее рана, а святла яшчэ няма. Абсурд. Да таго ж яго не хапае на перыферыйных вуліцах. Лепш бы святло тушылі з 12 да 4 ночы, а бліжэй да 5 уключалі, лічыць дэпутат.

## Каго будзем вучыць?

**Валянціна АПАНАСЁНАК, дэпутат Глыбоцкага раённага Савета дэпутатаў,** расказала, што ў гэтым годзе ў раёне закрылі пяць школ. Скарацілі навучальныя ўстановы, бо выязджаюць маладыя сем'і і вучыцца ў іх амаль няма каму. Цяпер, напрыклад, тыя, хто вучыўся ў аграгарадку Галубічы, вымушаны ездзіць у суседні населены пункт за чатыры кіламетры. Але гэта — не праблема, упэўнена Валянціна Апанасёнак, бо падвозіць вучняў рэгулярны аўтобус: трыма рэйсамі. Ён забірае дзетак і ў сад — раніцай і ўвечары. Настаўнікі, па словах дэпутата, таксама ўсе працаўладкаваны.

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by

ЧАРГОВЫ РАЗВОД

# ДАКУЧЛІВЫ СЭРВІС

## Каго выбіраюць сваёй «мішэнню» няпрошаныя электрыкі?

**Услед за прадаўцамі фільтраў, замкоў і вокнаў на рынак паслуг у Гродне выйшлі... электрыкі. Яны тэлефануюць альбо звоняць адразу ў дамафон і прапануюць жыхарам тэрмінова прывесці ў парадак праводку. А не тое, кажуць яны, можа быць позна...**



Што і казаць, алгарытм дзеяння выбраны дакладны. Спачатку кліенту трэба прапанаваць паслугу, а затым намаляваць жудасную карціну наступстваў, калі ён пачне сумнявацца ці наогул адмаўляцца. Дарэчы, такая схема вядома. Па ёй ужо нямала народу пацярпела ад рознага роду «спецыялістаў». Ёсць у гэтым спісе і прадаўцы цудадзейных фільтраў для вады, і майстры ўцяплення вокнаў, і так званыя замочнікі. А зараз гродзенцы сутыкнуліся яшчэ з адным тыпам спецыялістаў, якія дакучліва прапануюць свой сэрвіс, — з электрыкамі.

Так, за некалькі дзён у міліцыю Гродна звярнуліся каля двух дзясяткаў чалавек, паведаміў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гродзенскага аблвыканкама Максім БАЗЫЛЕНКА.** Грамадзяне расказвалі, што ім званілі на дамашні тэлефон, а некаторым і ў дамафон невядомыя асобы, якія называліся работнікамі нейкай арганізацыі, што займаецца электраабсталяваннем. Так званыя майстры спачатку цікавіліся станам электраправодкі ў кватэры, а затым прапаноўвалі свае паслугі па замене кабелю, разетак, выключальнікаў. Калі кліент раздумваў ці адмаўляўся ад паслугі, яны палохалі жыхароў пажарамі і іншымі наступствамі.

— Увесь жылы фонд знаходзіцца на абслугоўванні ЖЭСаў, дзе ёсць кваліфікаваныя электрыкі. У іх абавязкі ўваходзіць у тым ліку і замена электраправодкі ўсім ахвотным. Любы жыхар можа выклікаць спецыяліста, які вызначыць, патрэбны рамонт ці не, — растлумачыў **начальнік аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю АУС адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Гродна Мікалай ГАЛЯКЕВІЧ.**

А вось тыя, хто вырашыў даверыцца «левым» электрыкам, могуць аказацца ў пройгрышы. Бо замена электраправодкі такой фірмай будзе каштаваць 200 рублёў, прычым работы выконваюцца па мінімуме, з прымяненнем самых танных матэрыялаў, але заплаціць за іх прыйдзецца па максімуме. Напрыклад, аўтаматычны выключальнік абыходзіцца кліенту прыблізна ў 70 рублёў за штуку (кошт аналагічнага ў рознічным гандлі — ад 4 да 7 рублёў). Прадстаўнікі арганізацыі заключаюць дагаворы з абавязковай перадаплатай, якая ў выпадку скасавання дагавора кліенту не вяртаецца.

— Дакументы ў такога роду фірмаў складаюцца вельмі дакладна, і аспрэчыць іх цяжка, — папярэджвае Мікалай Галякевіч. — Таму гаспадарам, асабліва сталага ўзросту, варта быць уважлівымі, калі ім пагражаюць пажарамі і выхадам са строю бытавой тэхнікі ў выпадку, калі людзі не скарыстаюцца паслугамі фірмы.

Мне ў сувязі з гэтым прыпомніўся адзін званок ад прадстаўнікоў «аконнай» фірмы. Тэлефанавала дзяўчына, якая настойліва пераконвала мяне ў тым, што ў кватэры неабходна праверыць шчыльнасць прылягання шкла на вокнах. Маўляў, можа, гумавыя пракладкі знасіліся ці яшчэ якія недарэчнасці ёсць. А гэта так небяспечна!

Праверыць якасць гэтых самых пракладак, можа, справа не лішняя. Але тон дзяўчыны выклікаў насцярожанасць і разам з гэтым пытанні: чаму самі тэлефануюць, чаму не называюць арганізацыю, чаму навязваюць паслугу? На гэта дзяўчына адказала, што даныя аб стане майго акна будуць перадавацца ў гарадскую адміністрацыю. А калі я адмоўлюся, іх там за гэта нават пакараюць. А мне толькі і патрэбна, што дзверы адчыніць і майстра ў кватэру пусціць, які ўжо амаль што за дзвярыма стаіць...

Думаю, што разлік быў у нейкай ступені і на спачуванне. Маўляў, мы дзеля сваіх кліентаў гатовы вымовы атрымаць, а вы не хочаце пайсці насустрач! Прызнацца, я ведала і пра такія «разводы», і пра майстроў, якія спачатку прапануюць нешта замяніць за невялікі кошт, а потым аказваецца, што выканалі яны работу на 300—400 рублёў. Калі кліент разумее свой промах, адступаць ужо позна, бо пад дагаворам стаіць яго подпіс. Лаўцы лёгкай нажывы выбіраюць, як правіла, людзей сталых, адзінокіх, даверлівых. Каб няй адчулі клопат пра стан іх вокнаў ці той жа электраправодкі. Пры гэтым, вядома, не забываюць накруціць цану ў дзясяткі разоў.

> А між іншым, можна заўважыць, якім чынам узнікаюць такія маштабныя «кампаніі». Як толькі паўсюдна загаварылі пра якасць пітной вады і сталі з'яўляцца скаргі ад насельніцтва, адразу на сцэну выйшлі сумнеўныя фільтры. Не самы лепшы тавар, затое за высокі кошт.

Здарыліся трагедыі з дзецьмі, якія выпалі з вокнаў, — тут жа пачалася кампанія «аконных» майстроў. Вядома, на гэтай хвалі лягчэй пераканаць гаспадароў кватэр у неабходнасці свайго тавару.

Выпадкі з пажарамі кватэр актывізавалі электрыкаў. Яны шырокім фронтам пачалі сваю, чарговую, кампанію паслуг. Дарэчы, такая ўвага магла б быць сапраўды патрэбнай насельніцтву, калі б не адна акалічнасць. Вельмі дорага цэняць майстры свае паслугі, а прапановы часцей за ўсё накіроўваюць на сталых людзей. Вядома, чаму — іх, даверлівых, лягчэй падмануць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# У КАГО КЛЮЧ АД РАТУШЫ?

**У Полацку, самым старажытным горадзе краіны, сёлета год юбілеяў. Ужо адсвяткавалі 500-годдзе беларускага кнігадрукавання і ўласна 1155-годдзе. Яшчэ адна юбілейная дата — 1025-годдзе Полацкай епархіі... А налета споўніцца 520 гадоў надання гораду магдэбургскага права. У нашай пастаяннай рубрыцы, прысвечанай гісторыі мясцовага самакіравання, сёння распавядаем пра магістрат тых часоў.**

## Скардзіліся «па вертыкалі»

— У Полацку магістрат стварылі пасля надання гораду 7 кастрычніка 1498 года магдэбургскага права. На жаль, вельмі мала дакументаў, па якіх дакладна можна было б меркаваць пра першыя дзесяцігоддзі дзейнасці органа мясцовага самакіравання. Добра, што засталося значна больш крыніц пра яго функцыянаванне ў XVII—XVIII стагоддзях. Што да іерархіі, як у наш час сказалі б, «гарвыканкама» — магістрат падзяляўся на бурмістраўска-радзецкую і войтаўска-лаўнічую часткі. Лаўнікі падпарадкоўваліся бурмістрам і райцам. Бурмістры, райцы і лаўнікі засядалі ў ратушы. На «пасяджэннях» прысутнічалі лайнтвойт ці яго намеснік, — распавядае **старшы навуковы супрацоўнік Навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік» Максім МАКАРАЎ.**

Бурмістры праводзілі пасяджэнні, выносілі прысуды. Яны ж прымалі самыя важныя рашэнні, у тым ліку і фінансавыя. Райцы былі іх дарадцамі, спецыялістамі ў вобласці права, знаўцамі і абаронцамі правоў і прывілеяў. Яны мелі пячатку, ключы ад ратушы і скрынкі з гарадскімі прывілеямі.

Лаўнікі («прысяжнікі») праводзілі следчыя дзеянні ў судовых справах. Яны вывучалі сітуацыі на месцах здарэнняў, аглядвалі целы забітых, раны. Яшчэ ацэньвалі маёмасць і г. д.

Дзейнічала ў той час і «схема» абскарджвання.

— У прыватнасці, калі вынікі ацэнкі маёмасці ці вызначэння меж зямлі, праведзеных лаўнікамі, не задавальнялі чалавека, ён мог запатрабаваць паўтарэння тых жа дзеянняў камісіяй райцаў. А мог і ў апошнюю інстанцыю звярнуцца — да бурмістраў, — працягвае гісторык.

У подпісах пад дакументамі чыноўнікі нярэдка павышалі свой статус. Ды з такім размахам гэта адбывалася, што адзін з райцаў у 1682 годзе склаў пратэст супраць адпаведных дзеянняў лаўнікаў...

## Скарачалі штатны расклад

У XVII—XVIII стагоддзях, як, верагодна, і ў XVI стагоддзі, магістрат складаўся з трох сесій бурмістраў, райцаў і лаўнікаў. Кожная з іх засядала ў ратушы па чарзе — праз два гады на трэці.

Іх змена адбывалася ў дзень новага года па грыгарыянскім календары. Толькі ў 1654—1667 гадах, калі Полацк падпарадкоўваўся Маскоўскай дзяржаве, магістрат мяняўся 1 верасня — па сістэме летазлічэння ад стварэння свету.

— Можна меркаваць, што колькасць бурмістраў і райцаў на працягу двух вякоў заставалася нязменнай — па двое. А штат гадавых лаўнікаў паступова змяншаўся: спачатку з шасці да чатырох, потым да двух. Верагодна, гэта было выклікана паступовым — прыблізна трохразовым, скарачэннем насельніцтва горада з сярэдзіны XVII да сярэдзіны XVIII стагоддзя. Яшчэ больш скарачаць было нельга, бо пры магдэбургскім праве гарантавлася аднолькавае прадстаўніцтва ў магістраце асоб «рымскай» і «грэчаскай» веры, — канстатуе Максім Макараў.

Але часамураднікаў (членаў магістрата) не хапала. І праходзілася працаваць у «няпоўным складзе». У прыватнасці, 1 студзеня 1732 года бурмістр Тэадор Камковіч заняў месца ў ратушы, як адзначана ў гістарычнай крыніцы: «сам толькі, без калегі («рымскага» бурмістра) і без паноў райцаў...»

## Пры двух уладах

Даследчык паспрабаваў прасачыць ратацыю сесій полацкага магістрата ў згаданыя вышэй два стагоддзі.

Дакладна вядома, што ў 1602 і 1608 гадах у ратушы засядала адна і тая ж сесія магістрата. Напэўна, яна выконвала свае абавязкі і ў 1605 годзе. А «адпачывала» ў 1603—1604 і ў 1606—1607 гадах.

— Можна ўпэўнена сцвярджаць, што адбывалася рэгулярная ратацыя «кадраў» трох устойлівых па складзе сесій магістрата. У 1654 годзе Полацк занялі маскоўскія войскі. Персанальны склад магістрата моцна змяніўся. Але прынцыпы дзейнасці засталіся ранейшымі... У 1662 годзе маскоўскі гарнізон быў не ў стане надзейна забяспечыць абарону горада. Войска спаліла горад з умацаваннямі і схавалася ў замку. Большасць мяшчан перасялілася ў Дзісну або збегла. А мясцовы магістрат, відавочна, увогуле перастаў функцыянаваць, — працягвае суразмоўца.



**Запіс аб асабовым складзе гадавога магістрата 1727 года.**

У 1667 годзе Полацк зноў увайшоў у склад Рэчы Паспалітай. І магістратам сталі кіраваць прадстаўнікі той сесіі, якая дзейнічала перад вайной (амаль усе тады зберглі на тэрыторыю ВКЛ). Гісторык мяркуе, што гэтыя ж людзі працавалі і ў наступным годзе...

У першай чвэрці XVIII стагоддзя рэгіён знаходзіўся ў катастрафічным стане. Падчас Паўночнай вайны (1700—1721 гады) колькасць жыхароў паменшылася ў разы. У спісе супрацоўнікаў магістрата за 1704—1709 гады зусім мала прозвішчаў.

— Гэта наводзіць на думку пра недахоп ураднікаў і хранічны кадравы голад. Сітуацыя палепшылася толькі ў канцы другога дзесяцігоддзя XVIII стагоддзя, — працягвае Максім Макараў.

У прыватнасці, у 1750—1772 гадах колькасць бурмістраў павялічылася. Цікава, што гадавыя лаўнікі, якія занялі пасаду ў 1762 годзе — Ян Мірановіч і Рыгор Касабуцкі, — выконвалі свае абавязкі на працягу ажно сямі гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 7 лістапада 2017 года.**